

ДЗЕ ШУКАЦЬ ЗВЕСТКІ ПРА ПРОДКАЎ

Сямейная газета

ДЗЕЛЯ ГАРМОНІІ З САБОЙ І НАВАКОЛЬНЫМ СВЕТАМ

Сямейная газета



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 ВЕРАСНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 183 (30317)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ПЯТКЕВІЧ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Сустрэчы з людзьмі не толькі патрэбныя, яны вельмі цікавыя. Калі працуеш на важных дзяржаўных пасадах, важна ведаць, што хвалюе людзей, якія ў іх патрэбы. Беларусь — дзяржава для народа. Прэзідэнт патрабуе асаблівай увагі да зваротаў грамадзян, і гэта краевугольны камень усёй палітыкі работы з грамадзянамі ў нашай краіне. Трэба разумець, што хвалюе людзей, рэагаваць на праблемы і, калі трэба, выпраўляць памылкі. Гэты працэс узаемнага абмену вельмі карысны для двух бакоў. Бо ўлада працуе для таго, каб краіне і яе жыхарам было добра».*

# ДЫЗАЙН ПАД КАНТРОЛЕМ



**Тэхналагічныя лініі на ААТ «Керамін» аснашчаны комплексам сучаснага інавацыйнага абсталявання, якое дае магчымасць рэалізоўваць самыя смелыя задумы дызайнераў. За якасцю нанясення малюнка на плітку сочыць аператар аўтаматычнай лініі дэкарыравання вырабаў Віталіна БАЙДАКОВА. Нягледзячы на невялікі тэрмін работы на прадпрыемстве, яна добра спраўляецца са сваімі абавязкамі, з поспехам прымяняе веды на практыцы.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- **Вучэнні АДКБ «Непарушнае брацтва — 2024» пройдуць у Казахстане з 26 верасня да 7 кастрычніка.**
- Супрацоўніцтва беларускіх медыкаў з прадстаўнікамі кітайскай медыцыны правінцыі Чжэцзян будзе ўзмоцнена.
- **Беларускія мытнікі з 2000-х гадоў спынілі больш за 3 тыс. спроб кантрабанды наркотыкаў.**
- Больш як 2,6 тыс. ДТЗ з дзікімі жывёламі здарылася ў Беларусі з пачатку года.
- **Будаўніцтва зон чакання каля «Казловічаў» і «Варшаўскага моста» завершаць у 2025 годзе.**
- Вытворчасць пнеўмасеялак з электрапрывадам высейвальных апаратаў наладзяць у Дзяржынску.

### Соцыум

## КАНІКУЛЫ З КАРЫСЦЮ

### Служба занятасці працаўладкавала за лета амаль 35 тысяч падлеткаў, 39 тысяч працавалі ў студатрадах

**Каля 90 тысяч навучэнцаў мінулым летам падпрацоўвалі. Моладзь традыцыйна працаўладкоўвалі ў сферы паслуг, гандлю, сельскай гаспадаркі. А таксама ў шматлікіх студэнцкіх атрадах, у тым ліку на прамысловых прадпрыемствах. Маладых людзей і цяпер чакаюць на флагманах машынабудавання — МАЗе і Мінскім трактарным заводзе, а таксама заводзе «Атлант». Спецыялісты расказалі, як трапіць у студатрад, атрымаць там новую спецыяльнасць і якія абмежаванні існуюць для моладзі.**

#### Сфера паслуг, гандаль, сельская гаспадарка

Толькі пры садзейнічанні службы занятасці летам было працаўладкавана каля 34,8 тысячы навучэнцаў, паведаміў **начальнік упраўлення арганізацыі работы дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва і альтэрнатыўнай службы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Сяргей КАЦКО.** Гэта было зроблена як з фінансавай падтрымкай дзяржавы, так і за кошт сродкаў наймальнікаў. У цэлым з пачатку года ўжо працаўладкавана каля 44,5 тысячы маладых людзей. На гэтыя мэты дзяржавай накіравана 10,8 мільёна рублёў, а ўсяго на год запланавана 13,3 мільёна.

СТАР. 3

### Уражанні

## Сімвал яднання і незвычайны падарунак для Прэзідэнта

### Чым захапіў патрыятычны форум




Фота Данііла ХМЯЛЬНІЦКАГА.

**17 верасня Беларусь адсвяткавала важнае дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства. Масавыя актыўнасці прайшлі па ўсёй краіне, але самай галоўнай пляцоўкай у гэты дзень стала «Мінск-арэна». Яна аб'яднала 15 тысяч гасцей — звычайных беларусаў, удзельнікаў патрыятычнага форуму «Калі мы адзіныя». На форуме быў дадзены старт усебеларускай акцыі «Марафон адзінства». Па словах Прэзідэнта, марафон трыадзінства традыцый: нацыянальнай культуры, талентаў беларусаў, прыгажосці славянскай душы.**

СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X

24183

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2024 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

Міжнародны вектар

# «ЗРОБЛЕНА ЎСЁ, КАБ КОЖНАЯ ЖАНЧЫНА Ў НАШАЙ КРАІНЕ БЫЛА ШЧАСЛІВАЙ»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА ўзяла ўдзел у адкрыцці IV Еўразійскага жаночага форуму ў Санкт-Пецярбургу**

**Падчас свайго выступлення спікер адзначыла, што 2024 год азнаменаваны шэрагам найважнейшых падзей у лёсе беларускага народа і нашай краіны. Яна расказала, што ўпершыню праведзены адзіны дзень галасавання, падчас якога былі выбраны дэпутаты ўсіх узроўняў. Паспяхова адбылося першае пасяджэнне VII Усебеларускага народнага сходу — у яго новым канстытуцыйным статусе. Сёлета беларусы адзначылі 30-годдзе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і інстытута прэзідэнцтва, 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**



«Самае галоўнае дасягненне беларускага народа — гэта тое, што ў рэкордна кароткія па гістарычных мерках тэрміны пад мудрым і дальнабачным кіраўніцтвам Прэзідэнта нашай краіны мы змаглі пабудаваць сваю суверэнную і незалежную рэспубліку», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Па словах спікера, насуперак ангажаваным ацэнкам наша краіна паспяхова развіваецца і па праве можа служыць прыкладам многім іншым краінам свету. «Пра гэта сведчаць і высокія пазіцыі нашай краіны ў міжнародных рэйтынгах: Беларусь займае 34-е месца сярод 166 краін у Індэксе дасягнення Мэт устойлівага развіцця, 61-е месца сярод 169 — у Індэксе сацыяльнага развіцця, 69-е сярод 193 — у Глабальным індэксе чалавечага развіцця, — канкрэтызавала яна. — У рэйтынгу краін шчаслівага дзяцінства займае 35-е месца сярод 175 краін свету, 25-ю пазіцыю ў рэйтынгу самых камфортных краін для мацярынства».

У Беларусі жанчыны складаюць больш за палову насельніцтва. «Узровень жаночай пісьменнасці — 100 %, — звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі. — У нас кожны другі кіраўнік у краіне — жанчына, у парламенце доля жанчын складае 36 %. Працягласць водпуску па доглядзе дзіцяці — тры гады, і ён поўнасцю аплачваецца. Гэта толькі некаторыя лічбы і факты, якія сведчаць аб тым, што ў Беларусі створаны ўсе ўмовы, каб кожная жанчына магла свабодна працаваць, абапіраючыся на традыцыйныя каштоўнасці, ствараць сям'ю і выхоўваць дзяцей у духу павагі да сваёй гісторыі і культуры, дабівацца поспехаў у кар'еры, творчасці ці грамадскай дзейнасці, жыць у бяспецы і пад мірным небам. Увогуле, зроблена ўсё, каб кожная жанчына ў нашай краіне была шчаслівай».

Разам з тым беларускіх жанчын не можа не турбаваць эскалацыя сітуацыі вакол Беларусі, якая не спадае: сістэматычныя спробы ўмяшання звонку ва ўнутраныя справы нашай краіны, эканамічны ціск, мілітарызацыя прыгранічнай прасторы і ваенныя правакацыі, узвядзенне жалезных заслонаў, адзначыла спікер. «Мы асуджаем нелегітымную санкцыйную палітыку краін Захаду, стварэнне штучных бар'ераў для перамяшчэння грузаў і тавараў, свабоды перамяшчэння грамадзян, а таксама шматлікія дыскрымінацыйныя рашэнні ў краінах так званай развітой дэмакратыі, у аснове якіх — грубыя парушэнні правоў чалавека, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Заклікаем міжнародныя арганізацыі эфектыўна выконваць свае мандаты, забяспечваць выкананне прынцыпу суверэннай роўнасці дзяржаў, дабівацца спынення санкцыйнага самавольства, якое пагаршае глабальныя праблемы чалавецтва».

Па словах спікера, ніхто не мае права вызначаць лёс Беларусі. І гэта датычыцца кожнай дзяржавы. «Беларусь з'яўляецца паўнапраўным членам міжнароднай сям'і, і ў бягучых умовах глабалізацыі ўнутраны дабрабыт нашай дзяржавы ў многім залежыць ад сітуацыі на знешнім контуры, — лічыць Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы, жанчыны, не маем ніякага маральнага права заставацца абыякавымі да ўсяго, што адбываецца ў свеце».

Паводле слоў спікера, заакіянскае ваеннае лобі крывавжэрна паразітуе на бядзе мільёнаў людзей, сутыкаючы лбамі народы, якія жылі стагоддзямі ў згодзе, падсілкоўваючы канфлікты ў розных частках планеты зброяй і забароненымі боепрыпасамі. «Чырвоныя лініі ўсё больш размываюцца, ствараючы пагрозу рэальнай вайны планетарнага маштабу, пераможцаў у якой не будзе, — акцэнтавала ўвагу спікер. — У той час калі беларускія жанчыны і жанчыны з дружалюбных нам краін выступаюць за спыненне кровапраліцця і больш хуткія перагаворы дзеля дасягнення міру, мы бачым, як некаторыя палітыканкі на Захадзе насуперак галоўнай місіі ўсіх жанчын на гэтай зямлі — быць крыніцай натхнення і стварэння, папярэджваць канфлікты, прыміраць краіны і народы, — наадварот, заклікаюць да мілітарызацыі, ваеннай канфрантацыі і нарошчвання паставак зброі. Для нас такая палітыка ненатуральная».

**Паводле БелТА.**

Парламенцкі дзённік

# ДЭПУТАТЫ — ГЭТА ІДЭАЛАГІЧНЫЯ РАБОТНІКІ



**Роля і месца дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва Магілёўскай вобласці стала адной з тэм сустрэчы Старшыні Палаты прадстаўнікоў Ігара СЕРГЯЕНКІ з прадстаўнікамі Магілёўскага аблвыканкама, сілавых структур вобласці і структурных падраздзяленняў аблвыканкама.**

Такая сустрэча ў пашыраным фармаце дае магчымасць прааналізаваць, якая работа зроблена дэпутатамі ад Магілёўскай вобласці, пачуць меркаванне аб ёй, каб зрабіць яе больш канкрэтнай, прадукцыйнай і ўзаемадапаўняльнай, падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. «На маштабным мерапрыемстве, якое прайшло ў Дзень народнага адзінства на спартыўным комплексе «Мінск-арэна», Прэзідэнт звярнуў увагу і на работу дэпутатаў у іх акругах. Выбраннем кандыдата ў дэпутаты работа не завяршылася, а толькі пачалася», — дадаў спікер.

Выступоўца адзначыў, што ад Магілёўскай вобласці ў парламенце працуе 13 дэпутатаў, двое з якіх працягваюць сваю дэпутацкую дзейнасць пасля папярэдняга склікання. І гэта група згуртаваная, актыўная. Каб эфект ад яе дзейнасці быў больш уплывовы, трэба аб'яднаць высілкі выканаўчай і прадстаўнічай улады.

— Рэальны эфект ёсць толькі тады, калі мерапрыемствы праводзяцца сумесна з органамі выканаўчай улады, — падкрэсліў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Штомесяц дэпутат працуе тыдзень у акрузе. І кожная яго паездка павінна пачынацца са ўзаемадзеяння з выканаўчай уладай. Менавіта ў выканкаме ён атрымлівае інфармацыю аб пасяджэннях, грамадска-палітычных і іншых мерапрыемствах, якія праводзяцца ў раёне. Дэпутат найперш павінен выбудаваць дыялог з канкрэтным выканаўчым камітэтам. Усе павінна насіць сістэмны кіравальны характар. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — гэта ідэалагічныя работнікі, патэнцыял якіх павінен быць задзейнічаны, асабліва ва ўмовах прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, якая набліжаецца.

Ігар Сергяенка паведаміў, што дэпутата ў акрузе ўсе павінны ведаць у твар.

— Уносім карэктывы ў работу са СМІ, інфармуем загадзя аб дзейнасці дэпутата ў акрузе, — адзначыў ён. — На тэлебачанні з'явіўся новы праект «Адзін дзень з дэпутатам». Першым удзельнікам гэтай праграмы стаў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах Алег Дзячэнка, які расказаў пра сваю работу ў Асіповіцкім раёне. Актывізавалі прысутнасць дэпутатаў у сацсетках, практычна кожны дэпутат мае свой тэлеграм-канал.

Спікер звярнуў увагу дэпутатаў на работу са зваротамі грамадзян. «Трэба аператыўна рэагаваць на пытанні, якія паступаюць, — падкрэсліў ён. — Асноўныя кірункі нашай дзейнасці — пытанні сацыяльнай абароны насельніцтва. І тут не павінна быць фармалізму і бюракратыі.

З дакладам на тэму сацыяльна-эканамічнага развіцця выступіў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** Ён агучыў прыярытэтныя кірункі развіцця Магілёўскай вобласці і прааналізаваў работу ўсіх сфер жыццядзейнасці.

— Нам трэба выбудоўваць дакладную камунікацыю з дэпутатамі на ўсіх узроўнях, — рэзюмаваў ён. — Дэпутаты на месцах павінны падказваць, дзе, што і як. Мы ўсё разгледзім. На кожны сельвыканкам выдзелілі па 5 тысяч рублёў. Гэта добрая падтрымка, калі там нешта вырашылі зрабіць.

На сустрэчы таксама прагучала меркаванне пра важнасць работы старастаў на месцах.

— Гэтых людзей трэба задзейнічаць у поўным аб'ёме, яны лідары, — падкрэсліў Анатоль Ісачанка. — Да нас людзі вельмі часта ставяцца як да чыноўнікаў, а да старастаў стаўленне іншае, больш даверлівае.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### «Масад» заклаў узрыўчатку ў 5 тысяч пэйджараў «Хезбалы»



Ізраільская разведвальная служба «Масад» заклала ўзрыўчатку ў 5 тысяч пэйджараў, імпартаваных ліванскай групоўкай «Хезбала» за некалькі месяцаў да смяротных выбухаў. Пра гэта паведаміла агенцтва Reuters са спасылкай на інфармацыю высокапастаўленай крыніцы ў ліванскіх сілах бяспекі. Падчас беспрэцэдэнтнай аперацыі 17 верасня па ўсім Ліване былі ўзарваны тысячы пэйджараў. Ліванскі тэлеканал Al Jadeed са спасылкай на выконваючага абавязкі міністра аховы здароўя Лівана Фіраса Аб'яда паведамляў, што ў выніку выбухаў мінімум 11 чалавек загінулі, каля 4 тысяч атрымалі раненні. Як стала вядома Reuters, прылады былі мадыфікаваны ізраільскай разведвальнай службай. «Масад» укараніў унутр прылады плату з выбуховым рэчывам, на якую паступае код. Яго вельмі складана выявіць любымі спосабамі. Нават з дапамогай любой прылады або сканера», — сведчыць крыніца агенцтва. Тры тысячы пэйджараў узарваліся, калі на іх было адпраўлена закадзіраванае паведамленне. У кожным было да 20 грамаў узрыўчаткі, паведаміла ліванская крыніца Al Jazeera. Тым часам ваенныя Ізраіля адмовіліся каментаваць выбухі.

### Рэйтынг прэзідэнта Паўднёвай Карэі абваліўся да 20 працэнтаў



Рэйтынг адабрэння работы прэзідэнта Рэспублікі Карэя Юн Сок Ёля знізіўся да рэкордна нізкага ўзроўню за яго час на пасадзе. Гэта відаць з вынікаў апытання грамадскай думкі, праведзенага сацыялагічнай службай Gallup Korea, паведаміла ТАСС. Толькі 20 працэнтаў рэспандэнтаў становіча ацанілі работу прэзідэнта, 70 працэнтаў — адмоўна. «Узровень адабрэння стаў самым нізкім з моманту інаўгурацыі. Узровень крытычнага стаўлення — самым высокім», — адзначаецца ў публікацыі Gallup Korea. Самымі папулярнымі прычынамі неадабрэння работы прэзідэнта было «павелічэнне квот у медыцынскіх ВНУ» (18 працэнтаў), эканамічная сітуацыя ў краіне (12 працэнтаў), памылкі ў камунікацыі з грамадствам (10 працэнтаў), схільнасць да аднабаковых рашэнняў (8 працэнтаў).

### У Індыі затрымалі больш за 100 супрацоўнікаў Samsung, якія пратэставалі



Індыйская паліцыя затрымала 104 супрацоўнікі завода Samsung Electronics, паведаміла агенцтва Reuters. Па словах прадстаўнікоў паліцыі, затрыманыя планавалі правесці марш, не маючы адпаведнага дазволу. «Затрыманне азначае сабой эскалацыю забастоўкі на заводзе бытавой тэхнікі Samsung недалёка ад горада Чэнае ў штаце Тамілнад. Рабочыя байкатавалі працу на працягу сямі дзён, парушаючы вытворчасць, якая прыносіць прыкладна трэць гадавога даходу Samsung у Індыі ў памеры $12 млрд», — перадае агенцтва. Пачынаючы з мінулага тыдня супрацоўнікі Samsung пратэстуюць, патрабуючы павышэння заработнай платы, паляпшэння ўмоў працы і прызнання прафсаюза, які падтрымліваецца рабочай групай.

# КАНІКУЛЫ З КАРЫСЦЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З кожным годам расце колькасць ахвотных працаваць. Летась праз службу занятасці было працаўладкавана амаль 50 тысяч маладых людзей, праўда, у летні перыяд такіх было на 1,5 тысячу менш, чым сёлета. У гэтым годзе плануецца працаўладкаваць таксама не менш як 50 тысяч маладых грамадзян.

Улетку моладзь традыцыйна працавала ў сферы паслуг, гандлю, сельскай гаспадаркі. Паколькі непаўналетнія ад 14 да 16 гадоў абмежаваны ў відах работ, якія могуць выконваць, таму ў асноўным яны працавалі пры навучальных установах, займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі, рамонтам мэблі. Хлопцы і дзяўчаты працавалі на тэрыторыях у населеных пунктах, на сельскагаспадарчых работах, у будаўнічых арганізацыях, на прамысловых прадпрыемствах, выконвалі пагрузачныя, разгрузачныя работы. Самай папулярнай была сфера аказання паслуг, гандлю: там моладзь працавала камплектавальнікамі, займалася выкладкай тавару.



Фота БелТА.

На працягу лета штодня каля 17 тысяч вакансій было размешчана ў агульнарэспубліканскім банку вакансій, які знаходзіцца на партале дзяржаўнай службы занятасці. Там жа быў сфарміраваны пералік вакансій для моладзі, якая жадае працаўладкавацца ў вольны ад вучобы час, асобна былі пазначаны вакансіі для непаўналетніх, іх было каля сямі тысяч. І цяпер служба занятасці працягвае падтрымліваць вакансіі для моладзі. У актуальным стане на сёння знаходзіцца каля сямі тысяч запрашэнняў ад работадаўцаў, з іх каля дзвюх тысяч — для непаўналетніх.

## З якога ўзросту можна працаўладкавацца

Як расказаў **начальнік упраўлення нагляду за выкананнем заканадаўства аб ахове працы Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацабароны Вадзім ВАНСОВІЧ,** прыём на працу можна ажыццяўляць толькі з 14 гадоў. Прычым як па працоўным дагаворы — кантракце, так і па грамадзянска-прававым дагаворы. Аднак возьмуць на працу не кожнага 14-гадовага. Каб ва ўзросце з 14 да 16 гадоў уладкавацца па працоўным дагаворы, неабходна пісьмовая згода аднаго з бацькоў. Калі ж малады работнік захоча працаваць па грамадзянска-прававым дагаворы, то з 14 да 18 гадоў ён павінен атрымаць пісьмовую згоду двух законных прадстаўнікоў. Калі гэту ўмову не выканаць, то на працу такога маладога чалавека браць нельга.

Ёсць нюансы і па выбары відаў работ для непаўналетніх. Вызначаны спіс дазволеных відаў работ, а міністэрствам аховы здароўя вызначаны гранічныя нормы ўздыму цяжару і перамяшчэння грузаў уручную. Гранічныя нормы для моладзі складаюць: для дзяўчат 14 гадоў — 3 кг, 15 гадоў — 4 кг, 16 гадоў — 5 кг, 17 гадоў — 6 кг, для юнакоў — 6, 7, 10 і 12 кг адпаведна.

Вадзім Вансовіч прывёў у прыклад няшчасны выпадак, які адбыўся летась з маладым чалавекам на адным з прадпрыемстваў.

— Яго непасрэдны кіраўнік папрасіў дапамагчы перанесці цюк саломы, які важыў больш за 100 кг. Пры пад'ёме гэтага цюка нага ў маладога чалавека падвярнулася, ён упаў і атрымаў перапом. Службовая асоба наймальніка допусціла парушэнне — небяспечна арганізавала пагрузачна-разгрузачныя работы, што прывяло да траўміравання непаўналетняга.

Таму дзяржавай вызначаны і зацверджаны спіс работ, да якіх забараняецца прыцягваць падлеткаў. Напрыклад, забаронена работа на вышыні, верхалазныя работы, горныя, падземныя, работы, звязаныя з эксплуатацыяй якога-небудзь абсталявання, небяспечныя работы. Падлеткі 14—16 гадоў могуць выконваць толькі лёгкія віды работ, да якіх, напрыклад, адносіцца ручная мыйка аўтамабіляў, сельскагаспадарчыя работы па пасадцы і прапалцы прадукцыі раслінаводства без прымянення якіх-небудзь механізмаў і ядахімікатаў. Асобам, маладзейшым за 18 гадоў, забаронена выконваць работы, якія адносяцца да цяжкіх, а таксама са шкоднымі і небяспечнымі вытворчымі фактарамі. Аднак вышэйназваныя работы дапускаецца выконваць тым, хто праходзіць вытворчую практыку і з'яўляецца навучэнцам установы адукацыі, але норма працягласці рабочага часу не павінна перавышаць чатыры гадзіны ў дзень.

Акрамя таго, для непаўналетніх устаноўлена скарочаная працягласць рабочага часу. Дзеці 14—16 гадоў могуць працаваць не больш за 23 гадзіны на тыдзень (звычайны працоўны тыдзень — 40 гадзін). Маладым людзям 16—18 гадоў дазволена выконваць работу ўжо ў колькасці 35 гадзін у тыдзень. Гэтыя нормы дзейнічаюць у вольны ад вучобы час — летам і на канікулах. Калі ж малады чалавек хоча папрацаваць у час вучобы, напрыклад, пасля школы, то тут норма працягласці работы не павінна перавышаць паловы ад максімальнай нормы часу для ўзросту работніка. Гэта значыць, калі прадугледжана 35 гадзін у тыдзень, то падчас вучобы ў вольны час можна працаваць не больш за 17,5 гадзіны ў тыдзень.

Аб самых частых пытаннях, якія паступалі на гарачую лінію Міністэрства адукацыі па працаўладкаванні моладзі, расказала **начальнік Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра Юлія ЗІНКЕВІЧ.**

— З мэтай усебаковага інфармавання навучэнцаў аб магчымасцях працаўладкавання вельмі шмат інфармацыі сёлета размяшчалася на партале «Молодежь.бел», там ёсць спецыяльная спасылка, дзе кожны ахвотны можа атрымаць памятку аб тым, куды яму звяртацца. Сёлета 20—24 мая Міністэрствам адукацыі была арганізавана гарачая лінія па дапамозе ў арганізацыі занятасці. На яе паступіла каля 200 званкоў. Многія цікавіліся працаўладкаваннем дзяцей 14—16 гадоў, тэлефанавалі бабулі, дзядулі і самі дзеці, якія хацелі працаўладкавацца. У асноўным пытанні датычыліся алгарытму працаўладкавання моладзі ў канкрэтным рэгіёне, узросту, з якога навучэнец можа пачаць работу, дакументаў для працаўладкавання, відаў работ і вакансіі, а таксама кантактаў тэрытарыяльных камітэтаў БРСМ і рэгіянальных упраўленняў па працы і занятасці. Большасць пытанняў паступала з Мінска і Гродзенскай вобласці. Усім былі дадзены неабходныя тлумачэнні, — праінфармавала Юлія Зінкевіч.

Паводле аператыўнай інфармацыі, у чэрвені—жніўні гэтага года дапамаглі працаўладкавацца каля 33,5 тысячы маладых людзей ва ўзросце да 18 гадоў, у тым ліку тым, хто знаходзіўся на ўліку ў інспекцыях і камісіях па справах непаўналетніх, а таксама на ўнутрышкольным уліку (1,3 тысячы чалавек). Са студзеня да верасня ў складзе студэнцкіх атрадаў працаўладкавана больш за 45 тысяч чалавек. Усімі формамі занятасці на 1 верасня ахоплена каля 90 тысяч маладых людзей.

— Міністэрствам адукацыі, упраўленнямі адукацыі аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, установамі адукацыі прымаюцца меры па пашырэнні практыкі арганізацыі працоўнай занятасці непаўналетніх. Пашыраны магчымасці для работы байцоў студатрадаў, — адзначыла Юлія Зінкевіч.

## У студатрад па новую прафесію

Нормамі Указа Прэзідэнта Беларусі «Аб арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» для студэнтаў прадугледжана магчымасць не толькі папрацаваць у вольны ад вучобы час, а таксама пры неабходнасці прайсці кароткатэрміновае практыка-арыентаванае сертыфікаванае навучанне і атрымаць рабочую прафесію.

— Занятасць моладзі ў вольны ад вучобы час з'яўляецца прафілактычнай мерай, садзейнічае атрыманню першых працоўных навыкаў, дае магчымасць зрабіць больш усвядомлены выбар будучай прафесіі, стварае ўмовы для фінансавай падтрымкі сем'яў. Гэта мера накіравана на далучэнне навучэнцаў да працы з мэтай атрымання імі прафесійных навыкаў для больш лёгкай адаптацыі на рынку працы пасля заканчэння навучання, — дадала Юлія Зінкевіч.

Нягледзячы на тое, што лета скончылася, працоўны семестр працягваецца, і працаўладкавацца ў моладзі ёсць магчымасці круглы год. Напрыклад, можна паўдзельнічаць у працоўных праектах, якія цяпер рэалізоўваюцца на заводах МАЗ, Мінскім трактарным заводзе, «Атланце» і іншых, дзе працуюць вытворчыя атрады.

— Яны аб'ядноўваюць студэнтаў з розных рэгіёнаў і ВНУ, у залежнасці ад спецыяльнасці. У прадпрыемстваў ёсць патрэба ў вопытных, з пэўнымі навыкамі маладых людзях. Аднак нават калі навыкаў няма, рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў і ў цэлым БРСМ дае магчымасці прайсці навучанне, атрымаць спецыяльнасць, якая дазволіць працаваць на больш высокім кваліфікацыйным узроўні, — расказаў **сакратар ЦК ГА «БРСМ», старшыня Рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый» Павел АЛЕКСА.**

На галоўнай рэспубліканскай маладзёжнай будоўлі — будаўніцтве маладзёжнага патрыятычнага цэнтра ў Брэсцкай крэпасці — сёлета папрацавала больш за 1,5 тысячы байцоў студатрадаў. Аднак аб'ектамі ўвагі студатрадаўцаў з'яўляюцца і абласныя будоўлі ў рэгіёнах. У Віцебскай і Гродзенскай вобласці гэта аб'екты аховы здароўя, у Гомелі — буйны спартыўны аб'ект, у Магілёве — будаўніцтва музея абароны Магілёва.

— Запрашаем усіх ахвотных звяртацца ў камітэты БРСМ ва ўстановах адукацыі. Напрыклад, яшчэ ёсць магчымасць паўдзельнічаць у працоўным праекце «Атлант» у Мінску. У нас шмат ахвотных папрацаваць на канвеернай вытворчасці, мы нават праводзілі адбор. Увогуле, хачу адзначыць, што, калі малады чалавек вучыцца на педагога, ніхто не перашкаджае дадаткова стаць цесляром-бетоншчыкам, якраз БРСМ дае такую ўнікальную магчымасць, — адзначыў Павел Алекса.

Летась у студэнцкіх атрадах БРСМ было працаўладкавана больш за 51 тысячу чалавек. Сёлета ў іх складзе папрацавала больш за 45 тысяч навучэнцаў, у тым ліку 39 тысяч — падчас летніх канікул. Сярод іх 21 тысяча непаўналетніх юнакоў і дзяўчат. У базе арганізацый, дзе могуць працаваць студэнцкія атрады, цяпер больш як 51 тысяча працоўных месцаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

Па сутнасці

# Падмурак адзінства



**Усё часцей прыходзіцца канстатаваць, што гаджэты нам замяняюць родных і знаёмых, ТікТок — жывыя стасункі. Чалавек быццам унутры гэтага «сусветнага катла»: націснуў клавішу — і ты каля Эйфелевай вежы, адправіў запыт — дзясяткі старонак адказаў. Тэхналогіі нас аб'ядналі, але чалавечай цеплыні не адчуваем. У вірлівым свеце знаходзімся ў адзіноце.**

Роспач адзіноты здольная перамагчы адзінства. Цяпер гэтае свята не толькі пра ўз'яднанне нашага народа, цяпер гэта і пра адказ на выклікі сучаснага свету. Хопіць беларусам саромецца сябе, спрацаваных рук сваіх бацькоў, вясковай хаты, сваёй гісторыі. І пакуль мы будзем хіліцца то да адных, то да другіх — будзем і адчуваць сябе прымакамі або наогул — бабылямі. Так атрымалася і з датай аб'яднання. Пра пастарункі, «пся крэў», асаднікаў і Бярозу-Картузскую спачатку «забыліся» дзеля савецкага інтэрнацыяналізму, а пасля ўжо з-за дэмакратычнага касмапалітызму. Прагу пакалення Прытыцкага да аб'яднання народа прапілі ў варшаўскіх кавярнях, а памяць пра закатаваных у турэмных сутарэннях продкаў згубілі ў сучасных польскіх sklepy (крамах). Як суседзі будуць паважаць нас, калі мы самі сябе не паважаем? У таго ж польскага грамадства няма павагі да збеглых, што так імкнуліся далучыцца да Польшчы, зрабіць «як у Польшчы». Так, мы паважаем польскае грамадства, але ніколі не пагодзімся з палітыкай неапілсудчыны і ніколі не забудзем «асалоды» Kresy Wschodnie.

І, што цікава, цяпер зноў на палітычным тэатры нашага рэгіёна разгортваецца знаёмая ўжо драма, як у 1939 годзе. Нават гульцы тыя ж. Тады ў гэтай кампаніі не было заакіянскага «бенефіцыяра». Але загады гучалі з Лондана. Польскі ўрад у міграцыі хаваўся менавіта там.

Сёння тэзіс адзінства гучыць не толькі ў нацыянальным сэнсе, але і ў больш глабальным — у геапалітычным. Шалёны глабальны свет вучыць нас парушыць дзве асноўныя запаведзі: веру продкаў і памяць аб продках. Аснову, падмурак, без якога ніколі родная хата не выстаіць. А такое ўжо было. Менавіта гэта было філасофіяй асадніцкай палітыкі Польшчы Пілсудскага. Прабачце, а цяпер не так? Што трансліруюць на Беларусь медыйныя платформы за кошт польскага ўрада? І навошта афіцыйнай Варшаве столькі бруду ліць на суседнюю Беларусь, навошта падымаць пратэсны градус у беларусаў? Імперскія амбіцыі Рэчы Паспалітай.

Брэсцкая крэпасць — сімвал мужнасці савецкага салдата і савецкага народа. Аксіёма. Але ў месцы, дзе жыве памяць савецкага подзвігу, прапісалася і экспазіцыя, прысвечаная польскаму часу... Гістарычная справядлівасць. Мо, і так. Але чаму ў знакавым месцы нашай гісторыі няма сведчанняў пра Афанасія Філіповіча? Выдатнага беларускага асветніка — ужо за гэта гісторыя павінна яго памятаць. Але яшчэ большую справу ён зрабіў ужо ў сане ігумена. Дарэчы, месца яго служэння было каля сцен сучаснай Брэсцкай крэпасці. Святы, які кананізаваны праваслаўнымі вернікамі, адстойваў праўду, веру продкаў да апошняга ўздыху, пакуль зажыва не былі пахаваны сваімі катамі. Мабыць, нездарма і Дзень аб'яднання беларусаў супадае з днямі памяці Афанасія Брэсцкага. Гэты дзень пра тое, што нават голас з роднай зямлі гучыць набатам і поклічам — не страціць сябе і наша адзінства.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць у рэгіёнах

## Праекты — рухавік для развіцця...

### Аляксандра МІХЕЕНКА пра работу з людзьмі ў чарнобыльскіх раёнах

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандра Міхеенка з'яўляецца народний абранніцай ад Быхаўскай выбарчай акругі № 81. Акруга аб'ядноўвае чатыры раёны — акрамя Быхаўскага: Касцюковіцкі, Краснапольскі і Слаўгарадскі. Раёны складаныя, усе моцна пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, тры з іх, акрамя Быхаўскага, уваходзяць у склад паўднёва-ўсходняга рэгіёна, дзе дзейнічае асобная праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця. Але для Аляксандры Міхеенка гэта работа знаёмая, пра жыццё ў гэтых раёнах яна ведае не з нечых слоў. Парламентарыем яна стала пасля пасады старшыні Касцюковіцкага райвыканкама.**



#### Крамы на колах

— Больш за тое, я сама родам з Касцюковіч, ведаю, як жывецца ў маленькіх населеных пунктах, — удакладняе Аляксандра Мікалаеўна. — Калі працую ў рэгіёне, звяртаю ўвагу на значныя для насельніцтва моманты. Пытанні абслугоўвання на сяле заўсёды былі актуальныя. Напрыклад, гэтым разам маніторыла работу аўтакрам. Радуе, што негатыву ад людзей на работу гандлёвых аб'ектаў ад райспажыўкааперацыі няма. Для эканомікі сёння спажыўкааперацыя — наогул выратаванне. Калі ў населеным пункце, умоўна кажучы, жыве 100 чалавек, яшчэ мэтазгодна ўтрымліваць краму з нейкім скарочаным рэжымам работы. А дзе людзей меней, ніякага сэнсу няма. Ды і з прадаўцамі на сяле праблема, таму людзі з разуменнем ставяцца да крам на колах.

Дэпутат азнаёмілася з работай аўтакрам у Касцюковіцкім раёне. Наведала Смолькі, Фралоўку, размаўляла і з прадаўцамі, і з жыхарамі. Ацаніла асартымент аўталавак і пераканалася, што ён годны. Асабліва спадабалася новая аўталаўка — такія сёння набывае спажыўкааперацыя. Там усё сучаснае: вялікія халадзільныя куфры, прасторныя вітрыны.

— У Касцюковіцкім раёне людзі апошнім часам сталі вельмі станоўча адгукацца аб рабоце гэтага гандлёвага апарата, — заўважыла дэпутат. — Нядаўна тут змяніўся старшыня арганізацыі, адчуваецца, што працуе сумленна. Ажывіўся асартымент, пакупнікі задаволены, прадаўцы не ў крыўдзе.

#### Тэма народнага адзінства

Парламентарыі працуюць у сваіх акругах тыдзень у месяц, і работа гэта розная: прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы з працоўнымі калектывамі, насельніцтвам, наведванне арганізацый і прадпрыемстваў. У верасні працаваць давялося якраз напярэдадні Дня народнага адзінства. І Аляксандра Міхеенка арганізавала круглы стол, каб пагутарыць з насельніцтвам на гэту і іншыя тэмы. У якасці спікера запрасіла калегу, старшыню Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алега Гайдукевіча.

— Сустрэча прайшла пазітыўна, вельмі эмацыянальна, — дзеліцца яна ўражаннямі. — Прыйшлі вучні старшых класаў, навучэнцы ліцэя, працоўная моладзь, маладыя спецыялісты, якія прыехалі ў раён, ідэолагі, работнікі прадпрыемстваў. Сёння ў людзей ёсць запыт на такія жывыя зносіны з дэпутатамі ўсіх узроўняў. Яны жадаюць чуць адказы на свае пытанні з першакрыніц. Хочуць ведаць пра сітуацыю ў краіне і тую, што складваецца за яе межамі. Вядома, усе занепакоеныя бразгатаннем зброі каля нашых граніц. Асабліва пасля выпадку з украінскімі дронамі на тэрыторыі Касцюковіцкага раёна. Сёння на інтэрнэт-рэсурсах можна знайсці што заўгодна. Нехта спрабуе нас запужваць, лье бруд на нашу краіну і Расію, на Саюзную дзяржаву, на беларускую палітыку. Таму запыт на прамыя стасункі вялікі і ў сталага пакалення, і ў моладзі. На перспектыву мы і далей будзем ладзіць такія сустрэчы.

#### Настаўнікі дзеляцца набалелым

Асноўныя праблемы педагогаў былі разгледжаныя на Рэспубліканскім педагагічным савеце з удзелам Прэзідэнта. Падчас работы ў акрузе Аляксандра Міхеенка сустрэлася з настаўнікамі, каб даведацца, што іх хвалюе.

— Настаўнікі кажуць, што сёння перагружаны работай, — рэзюмуе яна. — Ёсць праблемы з вялікім дакументаабаротам. Але першачарговая задача настаўніка — даць веды. У Быхаўскім раёне сустракалася з дырэктарамі школ, кіраўнікамі ваенна-патрыятычных клубаў. Тэма мне вельмі блізкая. Два гады таму ў Касцюковіцкім раёне былі арганізаваны сумесна з міністрам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь Іванам Кубраковым ваенна-патрыятычны клуб «Зубр». Сёння мы назіраем станоўчыя вынікі яго дзейнасці. Гэтыя дзеці — лідары ў сваіх калектывах, карыстаюцца аўтарытэтам у аднагодкаў. У Быхаве таксама дзейнічаюць два ваенна-патрыятычныя клубы. Я прапанавала ў кастрычніку правесці спаборніцтва сярод усіх такіх клубаў Быхаўскай выбарчай акругі. Зробім віктарыну па веданне гісторыі, дадзім магчымасць юным знаўцам паказаць сябе. Ды і кіраўнікам ваенна-патрыятычных клубаў таксама ёсць чым падзяліцца, расказаць пра вопыт работы.

#### На першым месцы — бытавыя праблемы

Ніводная паездка дэпутата ў рэгіён не абыходзіцца без прыёму грамадзян. На першым месцы сярод пытанняў, якія хвалююць людзей, — жыллёва-камунальныя праблемы, рамонт дарог і дваровых тэрыторый.

— Гэтыя пытанні вядомыя нам і паступова здымаюцца, — кажа дэпутат. — Людзі часам не зусім аб'ектыўна ацэньваюць сітуацыю. Хочуць, каб усё было зроблена тут і цяпер. Даводзіцца тлумачыць, што патрэбна планамерная работа. Не бывае так, што звярнуўся — і адразу ж усё вырашылася. Патрэбны час. Калі пытанне гарачае і яго нельга адкласці, мясцовыя ўлады робяць усё, каб яго зняць. Ніхто ні ад кога не адмахваецца, наадварот, трымаюць на кантролі.

Вельмі шмат прыходзіць зваротаў на электронны адрас. Камусьці хочацца проста патэлефанаваць дэпутату і пагутарыць. Размаўляю з людзьмі, нешта тлумачу або бяру каардынаты, каб пракансультавацца з экспертамі, пасля даю тлумачэнні. Дэпутат павінен быць даступным для ўсіх: ён — народны чалавек. Я і раней была даступным кіраўніком, мне было цікава пачуць, што думаюць людзі, якія бачаць недахопы. Магчыма, не ўсе пытанні атрымліваецца вырашыць па тэлефоне, таму бяру на кантроль, паглыблена вывучаю. Напрыклад, людзі звярнуліся ў мой тэлеграм-канал па дарогах. Запрасілі, калі буду ў акрузе, пад'ехаць да іх. І я прыязджала, глядзела. Паставілі гэтыя вуліцы на кантроль, вывучаем абстаноўку.

#### Эканоміка — гэта наш дабрабыт

— Я працую ў Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, яна спецыфічная, — расказвае Аляксандра Міхеенка. — Праз нас праходзяць самыя розныя законапраекты, таму што ўсё завязана на грашах. І мы аналізуем гэтыя дакументы. Ёсць даручэнне Прэзідэнта прапрацаваць пытанне па наданні дадатковых паўнамоцтваў кіраўнікам райвыканкамаў. Як сказаў Прэзідэнт на адным з кадравых дзён, старшыня райвыканкама — гэта прэзідэнт на сваёй тэрыторыі. Пераглядаюцца заканадаўчыя акты, вывучаюцца магчымыя змяненні.

На раёнах трэба больш актыўна працаваць над пошукамі дзейсных інвестпраектаў па схеме «Адзін раён — адзін праект». Той праект, які працуе ў Касцюковіцкім раёне, пачынаўся яшчэ пры мне. Гэта вытворчасць вырабаў з тонкаліставога металу. Яго рэалізуе прыватны інвестар, якому мы прадалі аб'ект за базавую велічыню. Там ужо зроблена шмат чаго, укладзена болей чым 200 тысяч еўра. Я пастаянна кантралюю гэты аб'ект. Шмат працоўных месцаў не будзе, навейшая вытворчасць не padразумявае вялікую працоўную сілу, але ж гэта нашы падаткі. А добрая база бюджэту — гэта падтрымка сацыяльнай сферы. Вось набылі для раённай бальніцы новы апарат КТ, а гэта болей чым мільён беларускіх рублёў. Таму «Адзін раён — адзін праект» — вельмі важны рухавік для развіцця нашых раёнаў. Эканоміку сёння можна адсачыць па бюджэце. Калі мы бачым, што дарогі будуюцца, мадэрнізуюцца бальніцы, узводзяцца школы, гэта значыць, эканоміка працуе добра. Яна як лакмусавая паперка. Эканоміка паляпшаецца, умацоўваецца бюджэт. Выпрабаванні заходнімі санкцыямі зрабілі нас больш моцнымі. Той жа Беларускі цэментны завод працуе з колаў, як і практычна ўсе быхаўскія прадпрыемствы. Унутраны рынак увесь у іх распараджэнні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Аляксандры МІХЕЕНКІ.**

## Асаблівы акцэнт — на рабоце з моладдзю

**Паліна ВАСІЛЮК абрана дэпутатам Палаты прадстаўнікоў па Кобрынскай выбарчай акрузе № 12. З першых дзён работы ў парламенце Паліна Міхайлаўна вялікае значэнне надае рабоце ў акрузе, лічыць сваім абавязкам быць у пастаянным кантакце з выбаршчыкамі. Прыёмы грамадзян, сустрэчы з працоўнымі калектывамі, дыялогавыя пляцоўкі, удзел у раённых мерапрыемствах — формы работы выкарыстоўваюцца самыя разнастайныя.**

Адзін з кірункаў работы датычыць рэалізацыі наказаў выбаршчыкаў, якія знайшлі адлюстраванне ў праграме тады яшчэ кандыдата ў дэпутаты вышэйшага заканадаўчага органа ўлады. Менавіта пра неабходнасць будаўніцтва дзіцячай пляцоўкі на набярэжнай у Кобрыне гаварылі грамадзяне на адной з сустрэч са сваім кандыдатам. І вось справа зроблена. Пляцоўку для юных жыхароў Кобрына ўрачыста адкрылі ў Дзень горада. «Набярэжная — гэта месца прыцягнення людзей, асабліва дзяцей і моладзі, — сказала Паліна Васілюк. — Год таму тут з'явілася спартыўная пляцоўка, а цяпер вось і дзіцячая, што вельмі важна для актыўнага адпачынку ўсёй сям'і. Варта адзначыць, што за апошнія гады Кобрыншчына прырасла сацыяльнымі аб'ектамі, такім чынам рэгіён становіцца больш камфортным для жыцця. Калі дзіцячыя пляцоўкі запатрабаваныя, значыць, у людзей ёсць упэўненасць у заўтрашнім дні. І мы, дарослыя, павінны зрабіць усё, каб дзяцінства юных грамадзян краіны было шчаслівым і мірным».




Паліна Васілюк удзяляе асаблівую ўвагу дзецям, якія маюць пэўныя праблемы са здароўем. Гэтым летам парламентарый правяла сустрэчу ў аздараўленчым лагеры «Жамчужынка» Саюза цэркваў евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Там праходзіла змена для 80 асаблівых хлопчыкаў і дзяўчынак. З дарослымі гаварылі аб сацыяльнай палітыцы дзяржавы, аб духоўна-маральным выхаванні, грамадзянскай згодзе, адзінстве ў грамадстве. З дзеткамі дэпутат, педагог па адукацыі, таксама хораша пагутарыла.

Крыху раней парламентарый пабывала ў Кобрынскай дзіцячай вёсцы, створанай 30 гадоў таму першай у краіне сацыяльна-педагагічнай установе, якую склалі дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Разам з валанцёрамі БРСМ наведалі сям'ю Таццяны Травінай, у якой выхоўваецца 10 дзяцей. Былі падарункі, усмешкі, шчырая размова аб надзённых клопатах.

Паводле слоў Паліны Васілюк, жыць клопатамі сваёй акругі, быць у курсе праблем дапамагаюць прыёмы грамадзян, як асабістыя, так і сумесныя, з дэпутатамі розных узроўняў. Так было нядаўна, напрыклад, у Дзівіне, дзе разам з парламентарыем прыём вялі дэпутаты абласнога і раённага Саветаў. Удзел у пасяджэннях Кобрынскага райвыканкама і Брэсцкага аблвыканкама дазваляе трымаць руку на пульсе сацыяльна-эканамічнай сітуацыі рэгіёна. Са сваімі выбаршчыкамі дэпутат стараецца падзяляць не толькі клопаты, але і ўрачыстыя моманты, не забывае павіншаваць герояў жніва, перадавікоў вытворчасці з працоўнымі дасягненнямі.

У сваёй акрузе Паліна Васілюк рэалізоўвае праект «Адзін дзень з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў», асаблівы акцэнт робіць на рабоце з моладдзю. Сустрэчы, гутаркі, дыялогавыя пляцоўкі з навучэнцамі абодвух кобрынскіх каледжаў у рамках праекта даюць станоўчыя вынікі. Паліна Міхайлаўна прыцягвае юнакоў і дзяўчат да самых розных форм работы. Яны прысутнічаюць на прыёмах, рыхтуюць пытанні да дэпутатаў, вучацца аргументавана выказваць сваё меркаванне. І, паводле слоў дэпутата, на вачах узрастае іх прававая адукаванасць, уменне выдзяляць галоўнае, даваць ацэнку. Напрыклад, пасля ўдзелу ў праекце «Адзін дзень з дэпутатам» да яе на прыём ужо ў якасці выбаршчыкаў прыйшлі двое навучэнцаў каледжа сферы абслугоўвання. Прыйшлі найперш, каб спытаць парады, а калі атрымаецца, і атрымаць пэўную дапамогу. Адзін хлопец пасля атрымання спецыяльнасці кухара марыць распачаць сваю справу, хацеў параіцца, а другі папрасіў дапамагчы з працаўладкаваннем. І дэпутат узяла шэфства над гэтымі навучэнцамі, у далейшым пастараецца ім паспрыяць.

У пачатку верасня дыялогавая пляцоўка з моладдзю адбылася на базе політэхнічнага каледжа. Там сабраліся юнакі і дзяўчаты з многіх устаноў адукацыі. Нагодай стаў дзень нараджэння БРСМ. Але тэмы ўздымалі самыя розныя. На сустрэчы быў вядомы кобрынскі блогер ПалВаныч, які з'яўляецца актывістам БРСМ і памочнікам дэпутата. Ён гаварыў з аўдыторыяй на роўных, у тым ліку пра сур'ёзныя рэчы. Адным словам, сустрэча аказалася плённай.

— Люблю працаваць з моладдзю, — дзеліцца думкамі Паліна Васілюк. — Як ідэалагічны работнік з 19-гадовым стажам перакананa, што патрыёта можа выхаваць толькі патрыёт. Гэтае выказванне Прэзідэнта маю на ўвазе як адзін з галоўных пастулатаў сваёй работы. І вельмі радуюся, калі ў выніку стасункаў з маладымі людзьмі заўважаю ў іх парасткі сталых, дарослых разважанняў, калі яны дэманструюць імкненне працаваць у сваёй краіне, прыносіць карысць сям'і, Радзіме. Думаю, што праект «Адзін дзень з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў» варты таго, каб яго працягваць і развіваць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з архіва дэпутата.**

Сямейная газета
Выпуск № 16 (241)

Як ёсць

# Хто зашмат жадае, той нічога не мае

*«ПАШЧАСЦІЛА дзеўцы... Такі чалавек!» — казалі жанкі ў пад'ездзе, але нічога «такога», выключнага, Ніка ў мужы сваім не бачыла. Ну, падумаеш, першы ўстае і гатуе сняданак, падумаеш, вечарам, з прадуктамі цвярозы вяртаецца дамоў і адразу ж бярэцца дапамагаць — гатаваць, прыбіраць, мыць посуд... Так жа і павінна быць, калі хоча, каб жонка магла адпачыць: нешта пачытаць, паглядзець фільм, разам прайсціся па вуліцах.*

*Вось гэта, апошняе, мужу падабалася найменш, бо жонка вельмі любіла збочваць — заходзіць ці не ў кожную з крам і крамак.*

*На шчасце, вялікіх прамтаварных побач з домам не было, на прадуктовыя грошай хапала, і яны амаль не сварыліся...*

*А потым у іх з'явілася дачка. І ён з той радасці мог наогул не есці і не спаць — толькі б Ніка хутчэй ачуняла, адышла пасля родаў, толькі б карміла маленькую сваім малаком і лішні раз не злавалася.*

*Па вялікім рахунку, не было на тое прычын: усе «практычна здаровыя», кватэра, хоць здымная, але ёсць, халадзільнік поўны, суседзі добрыя, тэхніка ўся працуе, бацькі дапамагаюць — толькі намякні...*

*Жонка, між тым, падставы знаходзіла. Яе, па-першае, вельмі стамляла, «даставала» дзіця, па-другое, напружвала лішняя вага, якую набрала за час цяжарнасці і скінуць, вярнуцца ў «норму» (хто яе толькі выдумаў?!) ну ніяк не магла; па-трэцяе, не хапала ў гардэробе новага моднага адзення, плакала, што боты на зіму адны... А ў суседкі — дзве пары новых!*

*І кватэра ў яе свая, і машына, і мэбля дарагая, і на стале круглы год цэлая ваза фруктаў.*

*— Вось гэта — муж, вось ён — зарабляе! — папракала Ніка свайго.*

*Ён, вядома, перажываў, падумваў змяніць работу. Але ж не маленькі ўжо быў, не дурны: нешта знайшоўшы, хадзіў «у разведку». І ці не ўсюды назіраў адно: кожны з работадаўцаў стараецца выціснуць з работніка як найбольш, а заплаціць — найменш; фірмы ды фірмачкі часта ідуць на дно — людзі застаюцца «за бортам».*

*Нечага падобнага ён для сябе не хацеў. Да таго ж на гэтай рабоце яму абяцалі павышэнне і службовае жыллё, стабільна плацілі: грошай хапала — на кватэру, на ежу, на патрэбныя абновы, на прысмакі для малой...*

*А цацкі для яе ён сам «знаходзіў»: на рабоце нарэзаў пляскатых драўляных кружочкаў (малая на падлозе з іх «сцежкі» рабіла), у парку, сярод карэньчыкаў, «чорціка» і «змяю» падабраў, кветак мог нарваць ля пад'езда... Кацяня аднойчы прынёс...*

*Жонка крыкам тады зайшлася, казала, што дзіцяці яно не патрэбна, што калі заводзіць жывёл, то хіба пародзістых, каб не сорамна было паказаць...*

*Пакуль яна гэта крычала, ён апрануў малую, пад крысо пінжака пасадзіў катка, і яны падаліся на вуліцу.*

*Жонка таксама пайшла — у суд, з заявай на развод.*

*...Пасля яго — і досыць хутка — у яе з'явіўся першы бой-фрэнд (каханак, сужыцель...), потым другі.*

*Яна за гэтага нават замуж пайшла б: старэйшы на 12 гадоў, двое дзяцей, жанаты, але заўсёды пры грашах. Са здымнай кватэры на ўскраіне ён перавёз іх у такую ж здымную, але ў цэнтры, новы тэлевізар купіў, на тыдзень звазіў на Нарач...*

*Але разводзіцца не хацеў. І самадур быў: і тое яму не так, і гэта не гэтак, слова не скажы, без ведама рубля не патраць...*

*Ледзь «развязалася» — яшчэ і сплачваць прыйшлося за ўсё, што на яе патраціў: за тэлевізар, за тую паездку, жытло...*

*Вось тады і вырашыла: кропка, больш — ніякіх самадураў і «ніякай галоты». Калі звязвацца з кім, то з чалавекам, які ўжо адбыўся, на ногі стаў, можа забяспечыць... З тым, хто прыедзе на белым «мерседэсе» (ну чаму б і не?!), дзверцы перад ёю расчыніць, пасадзіць і павязе — у прыгожае, багатае жыццё з курортамі, футрамі, ананасамі...*

*На бляск, на прывід яго, як тыя ж матылькі, ляцяць, імкнуць маладзіцы. Каб, як правіла, апячыся і застацца без крыл...*

*Ці крылы не патрэбны? Калі ёсць «мерседэс»?*

**Валянціна ДОЎНАР.**

Тыя, хто побач

Алеся Кузняцова:

# «МОЙ ВАРЫЯНТ ШЧАСЦЯ — СЯМ'Я»



**ПІСЬМЕННІЦА Алеся Кузняцова лічыць сябе вельмі шчаслівым чалавекам. Будучы вядомым у Беларусі прадзюсарам і канцэртным дырэктарам, яна ў нейкі момант стала пісаць кнігі і сёлета нават атрымала Нацыянальную літаратурную прэмію ў намінацыі «Дэбют». Яна паспяхова рэалізоўваецца ў новай для сябе якасці. Не ў малой ступені таму, што яе падтрымлівае каханы муж, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Валерый Шмат, разам з якім яны ўжо 20 гадоў займаюцца «Арт-групай «Беларусы». Так атрымалася, што на пачатку сумеснага шляху Алеся арганізоўвала творчасць мужа. І раптам надышоў момант, калі ў яе з'явілася свая асобная творчасць — пісьменніцкая. Пры гэтым яна не перастала працаваць з групай «Беларусы», больш за тое, узмацніла гэты кірунак, атрымаўшы адукацыю рэжысёра, ладзіць фестывалі. Няўжо ж можна стольки паспяваць, з'яўляючыся пры гэтым шматдзетнай мамай?..**

— Калі людзі кажуць: «У мяне няма часу, каб займацца любімай справай», мне хочацца запярэчыць, што хутчэй няма жадання, таму што час мы можам знайсці заўсёды: інакш спланаваць сваё жыццё, знайсці нейкіх памочнікаў. Гэта значыць, усё залежыць ад нас. Калі я гэта зразумела, тады і пачала пісаць кнігі. І з таго моманту ў маім жыцці стала ўсё само сабой атрымлівацца. Звычайна гавораць, што аўтар павінен напісаць кнігу, потым знайсці выдавецтва, доўга стукацца ў дзверы, прасоўваць кнігу і шукаць сваіх чытачоў. А ў мяне ўсё атрымалася наадварот: я адпусціла кнігу «Калі трашчыць лёд» у свет (яна была ў электронным выглядзе), і яе ацанілі чытачы. Потым мне прапанавалі стаць аўтарам аднаго з найбуйнейшых выдавецтваў Беларусі. А яшчэ праз час на мяне выйшлі прадстаўнікі буйнога расійскага выдавецтва і прапанавалі выдаць серыю маіх кніг. Былі перагаворы, і мы знайшлі кампраміс паміж двума выдавецтвамі. У верасні ў Беларусі запланаваны выхад ужо трэцяга майго рамана. Мусіць, усё атрымліваецца, таму што я вельмі люблю жыццё, люблю людзей і імкнуся, каб вакол мяне былі светлыя людзі, аднадумцы, тыя, хто таксама імкнецца да развіцця і нешта стварае.

Так было з самага пачатку нашага сумеснага жыцця: мы з мужам выбралі справу, да якой ляжыць душа, і імкнуліся зрабіць гэту справу прафесіяй. Нам гэта ўдалося. Мы адкрылі ўласны прадзюсарскі цэнтр «Залатыя галасы», а я яго дырэктар. Мы абодва працаголікі, ведаем, што калі ёсць мэта, то ты павінен прыкласці не толькі сваё сэрца, свае мары, але самае галоўнае — свае дзеянні.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

Віншуем!

# КАРАЛЕВА ЖЭНЯ




**НА міжнародным конкурсе прыгажосці і талентаў для дзяўчат і жанчын у інвалідных вазках «Народжаная перамагаць» у Чалябінску Яўгенія ДУЛЬСКАЯ са Столінскага раёна заваявала тытул «Каралева дружбы». Першай прыгажуню, шматдзетную маму павіншавала дэпутат раённага Савета, дэлегат УНС, дырэктар Столінскага ТЦСАН Людміла Мароз.**

### Шматдзетная маці са Столінскага раёна паспяхова выступіла на конкурсе прыгажосці і талентаў

Конкурс для дзяўчат і жанчын з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, якія рухаюцца з дапамогай інвалідных вазкоў, праводзіцца ў Расійскай Федэрацыі восьмы раз. Сёлета ў спаборніцтвах удзельнічалі 12 канкурсантак з розных краін і рэгіёнаў Расіі. Удзел Яўгеніі стаў магчымым дзякуючы падтрымцы тэлеканала АНТ, Столінскага райвыканкама, ТЦСАН і раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын».

Жэня была адзінай канкурсанткай з Беларусі. Паводле правілаў, яе суправаджаў толькі адзін чалавек. На машыне яны дабраліся да Масквы, а далей — самалётам у Чалябінск.

Адбор на конкурс пачаўся паўгода таму. Яўгенія Дульская прадстаўляла арганізатарам сваю відэавізітоўку, сацыяльна значны праект, творчы нумар. З 26 жніўня да 6 верасня для канкурсантак праводзілі творчыя майстар-класы. І ў фінале кожная з удзельніц выступіла са сваім нумарам. Жэня таксама змагла даказаць, што, нягледзячы на абмежаваныя магчымасці здароўя, працягвае жыць цікава і ярка.

У фінале яна заваявала тытул «Каралева дружбы». І гэты поспех стаў вынікам штодзённай работы над сабой, духоўнай сілы і любові да жыцця, а таксама падтрымкі многіх людзей.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «ПЕРАЗАГРУЗКА» ЎЛАСНАГА ЖЫЦЦЯ

## Чаму споведзь варта лічыць «пераменай мыслення»

**СПОВЕДЗЬ — адно з хрысціянскіх таінстваў, якое спрыяе ачышчэнню душы ад граху. Вось, напэўна, і ўсё, што большасць людзей ведае ў нашы дні аб абрадзе. Тым часам гэта старажытны, правераны стагоддзямі спосаб узнаўлення гармоніі з сабой і навакольным светам, сцвярджаюць святары. Што ж здольная даць споведзь кожнаму з нас у няпростым сучасным свеце, мы спыталі ў настаяцеля прыхода храма свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага Аляксандра ПАЛЬЧЭЎСКАГА.**

### АДКРЫЦЬ ДУШУ ГОСПАДУ

***— Айцец Аляксандр, што такое споведзь? У чым яе адрозненне, скажам, ад візіту да псіхолага, дзе чалавек таксама адкрывае душу, паказвае не «парадны фасад», а «цёмныя пакоі» свайго жыцця ў надзеі, што яму дапамогуць пазбавіцца ад унутранага разладу?***

— Перш за ўсё, споведзь — адно з сямі таінстваў Царквы. І тут, з аднаго боку, мы разглядаем знешні абрад, а з другога — дзеянне Бога, гэта значыць духоўнае вымярэнне. Прыходзячы на споведзь, мы адкрываем душу не чалавеку, а найперш Богу. А святар, па сутнасці, — такі ж звычайны, грэшны чалавек, як і той, хто спавядаецца — усяго толькі поўны спагады сведка гэтага пакаяння перад Богам. Вядома, кожны святар мае пэўны духоўны досвед і гатовы накіраваць чалавека, падказаць яму нешта, адказаць на пытанні. Але самае галоўнае, паўтаруся, — на споведзі мы адкрываем душу Госпаду: гэта Ён прымае нашу споведзь.

**«Сапраўднае пакаянне — гэта калі мы настройваемся больш ніколі не здзяйсняць тое, у чым пакаяліся».**

***— Тады навошта патрэбен сведка? Бо, здавалася б, душу Богу можна адкрыць «наўпрост»...***

— Гэтае пытанне задаюць часта і ў адносінах да іншых таінстваў. Ці можна звяртацца напрамую да Бога? Так, гэта магчыма, але гэтага не дастаткова. Царква — гэта «духоўны арганізм», які стварыў Бог. Сам Гасподзь даў чалавеку гэты сродак, каб уступаць у духоўныя зносіны з Ім. І гэта датычыцца ў тым ліку таінства споведзі. З моманту ўтварэння Царквы апосталы здзяйснялі гэтае таінства па ўказанні Хрыста — такім чынам, крыніцай узнікнення споведзі стаў Бог. А святар — гэта здзяйсняльнік абраду, знешніх дзеянняў, без якіх таінства не можа адбыцца. Як і любое іншае таінства — хрышчэнне, вянчанне, сабораванне... Сам над сабой чалавек таінства здзейсніць не можа, яму патрэбна дапамога асоб, якія, скажам так, абраны праводзіць гэтыя абрады. Спачатку гэта былі апосталы, потым — святары.

### АБ НЕБЯЗГРЭШНАСЦІ СВЯТЫХ І ТАЯМНІЦЫ СПОВЕДЗІ

***— Калі казаць пра знешні, абрадавы бок, як адбываецца таінства споведзі?***



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

— Абрад прадугледжвае пэўную паслядоўнасць чытання богаслужэбных малітваслоўяў. Такім чынам святар настройвае, рыхтуе чалавека непасрэдна да таінства споведзі. І ў адной з малітваў, з якімі мы звяртаемся да Бога, ёсць такая фраза ў дачыненні да чалавека, які прыходзіць да споведзь: «Злучы яго са сваёй святой, саборнай апостальскай Царквой». Здзяйсняючы грахі, чалавек тым самым аддаляе і адлучае сябе ад Царквы. І таінства споведзі — той сродак, праз які можна вярнуцца назад, у Царкву, і злучыцца з ёй.

***— Як падрыхтавацца да споведзі?***

— Неабходна вялікая ўнутраная праца, асабліва калі на споведзь ідзяце ўпершыню. Некаторыя духоўнікі раяць узяць лісток паперы і дэталёва прагледзець сваё жыццё з самага дзяцінства. Глыбока прааналізаваць учынкі, якія мы не хацелі б больш здзяйсняць, і словы, за якія нам сорамна. Знайсці ў сваім жыцці ўсё тое, што супярэчыць прынцыпам любові, міласэрнасці, дабра. У жыцці кожнага бываюць такія словы і ўчынкі, з якімі мы не жадаем атаясамляць сябе. Вось пра іх і трэба сказаць на споведзі. На грэчаскай мове споведзь гучыць як «метаноя», даслоўны пераклад — «перамена мыслення». Гэта вельмі важны момант. Які сэнс у споведзі, калі чалавек каецца, а потым зноў здзяйсняе тыя ж грахі? Сапраўднае пакаянне — гэта калі мы настройваемся больш ніколі не здзяйсняць тое, у чым пакаяліся. Гэта якраз і ёсць змена нашага мыслення. І тут — два аспекты ўнутранай працы. З аднаго боку, гэта намаганне маёй волі, мой выбар: я адмаўляюся здзяйсняць гэты грэх, прыкладаю намаганні да таго, каб яго не паўтараць. З другога — у гэтым імкненні мяне падтрымлівае садзейнічанне Божай Благадаці: Гасподзь дае мне сілы спраўляцца з грахом.

***— Споведзь адбываецца сам-насам? Ці існуе таямніца споведзі?***

— Так, таінства споведзі заўсёды праходзіць строга індывідуальна. І таямніца споведзі захоўваецца няўхільна, гэта вельмі важнае кананічнае пытанне: ні пры якіх абставінах яна не можа абвяшчацца, пра што б ні даведаўся святар. Ён можа ад сябе выказаць стаўленне Царквы да таго ці іншага граху, можа ў нейкім выпадку нагадаць чалавеку, што гэта парушэнне не толькі Законаў Божых, але і законаў чалавечых. Але адказнасць за свае дзеянні чалавек нясе сам. У цэлым, святар з асабістага вопыту і з досведу Царквы можа параіць, прапанаваць вырашэнне сітуацыі. Але чалавек мае права прымаць ці не прымаць гэту параду.

***— Але як святару, які прымае споведзь, пазбегнуць ацэначных меркаванняў? Бо часам можна пачуць тое, што здольна выклікаць асуджэнне...***

— Калі ў аддзяленне траўматалогіі ў адну палату трапляюць два чалавекі: у аднаго зламаная рука, у другога — нага, — яны не асуджаюць адзін аднаго. Яны дзеляцца гісторыяй сваіх траўм, сваім болем, жадаюць адзін аднаму найхутчэйшага выздараўлення. Грэх — гэта духоўная хвароба, і кожны чалавек у той ці іншай ступені да яе схільны. Бо і святары спавядаюцца адзін аднаму, ім таксама неабходна духоўнае ачышчэнне. Працягваючы алегорыю з аддзяленнем траўматалогіі, святар на споведзі — не ўрач, а такі ж пацыент з пераломам, ён — практычна ў тым жа становішчы, што і чалавек, які прыйшоў да споведзі. Нават калі мы гаворым пра святых — яны таксама не бязгрэшныя, і колькі жылі, столькі змагаліся з грахом у сабе. Святасць — гэта напрамак руху, а не канчатковы пункт на шляху. Чалавек спатыкаецца, падае, каецца, падымаецца і ідзе далей. Пераадольвае грэх і раскрывае ў сабе хрысціянскія дабрадзейнасці. Так што няхай вас не спыняе пачуццё фальшывага сораму. Бо мэта споведзі — аднавіць яднанне з Богам, прысутнасць Бога ў вашым жыцці. Грэх перашкаджае чалавеку бачыць Бога, а споведзь аднаўляе зносіны з Ім.

**«Неабходна вялікая ўнутраная праца, асабліва калі на споведзь ідзяце ўпершыню».**

### ПРА «ДУХОЎНЫ РЭАЛІЗМ» І АДЧУВАННЕ ШЧАСЦЯ

***— Наколькі «папулярнае» ў нашых сучаснікаў таінства споведзі? Яно не прадугледжвае прыгожых атмасферных абрад, як, напрыклад, вянчанне або хрышчэнне. Да таго ж патрабуе вялікай унутранай працы...***

— Людзі прыходзяць на споведзь даволі часта. Бо, незалежна ад узросту і статусу, любы чалавек у нейкі момант жыцця прыходзіць да адчування ўнутранай напругі, разладу ў душы. Каб атрымаць адказы на пытанні, якія яго непакояць і нават мучаць, часта ён ідзе менавіта ў храм. І ў гэтым выпадку споведзь — моцны сродак, здольны даць унутранае суцяшэнне і вярнуць гармонію. Многія менавіта праз споведзь упершыню адкрываюць для сябе, што такое Царква. І ў далейшым прыходзяць да іншых складнікаў хрысціянскага жыцця.

***— Як часта трэба спавядацца?***

— Паводле ўнутранага адчування, па меры неабходнасці: калі ў душы назапашваюцца цяжар і напружанне. Кожнае наша слова або дзеянне і нават думкі пакідаюць след і ў нашай душы, і ў целе, аказваюць уплыў і на навакольных людзей, і на нас саміх. Проста так падзеі, словы і думкі не раствараюцца, яны накладваюць на нас свой адбітак, які часам становіцца цяжкім грузам. А споведзь здольная зняць гэты груз з нашых плячэй, даць адчуць лёгкасць, вызваленне, прымірэнне — і на ўзроўні душы, і на ўзроўні цела. Многія людзі пра гэта сведчаць. У адной дзяўчыны, якая прыйшла на споведзь упершыню, я пасля таінства спытаў аб яе адчуваннях. Яе першая споведзь была доўгай і няпростай, яна правяла вялікую духоўную працу. І гэтая дзяўчына сказала: «Адчуваю сябе як пасля лазні». Сапраўды, нават у тэкстах богаслужэнняў ёсць параўнанне таінства споведзі з духоўнай лазняй: душа ачышчаецца ад грахоў і памылак.

Як часта праводзіць «ачышчэнне», кожны выбірае сам. Хтосьці прыходзіць раз у тыдзень, хтосьці — раз у месяц. У практыцы Праваслаўнай царквы таінства споведзі і таінства Прычасця непарыўна звязаны. Калі чалавек рыхтуецца прыняць Прычасце, перад гэтым ён прыходзіць на споведзь. Неабходнасць спавядацца мае на ўвазе і падрыхтоўка да хрысціянскіх свят: падчас Боскай Літургіі адбываецца таінства Прычасця, а значыць, перад гэтым патрэбна споведзь.

Хачу падкрэсліць: менавіта споведзь — найлепшая падрыхтоўка да царкоўных свят. «Блажэнныя чыстыя сэрцам, бо яны Бога пабачаць» (Мф. 5: 8), сказана ў Евангеллі. Часта мы няздольныя бачыць Бога ў нашым жыцці, у гэтым свеце і ў іншых людзях, таму што наша душа перапоўнена грахом.

***— Але ж тое, што адзін чалавек расцэніць як грэх, іншы не заўважыць і грахом не палічыць...***

— Сапраўды, ёсць такія грахі, якія мы не лічым за грэх. Акрамя таго, бываюць грахі свядомыя і неўсвядомленыя. Але мы маем евангельскія запаведзі, і гэта духоўныя арыенціры, якія дапамагаюць фарміраваць унутраны стрыжань, вучаць разумець, што такое грэх. Вывучаючы вопыт духоўнага жыцця святых, мы бачым: чым больш яны раслі духоўна, тым больш бачылі ў сабе грахоў і недахопаў. Бывае, чалавек прыходзіць на споведзь і яму няма чаго сказаць, акрамя пераліку сваіх станоўчых якасцяў: «Я нікому не зайздрошчу, стараюся рабіць дабро, дапамагаць людзям...» Гэта сведчыць толькі аб тым, што чалавек недастаткова глыбока сябе ведае. У кожным з нас ёсць праявы тых ці іншых грахоў, проста мы не хочам ці не гатовыя пакуль гэта прызнаць. Бачыць свае слабыя бакі насамрэч карысна: дапамагае ўдасканальвацца.

***— Псіхолагі сцвярджаюць: важна бачыць свае моцныя бакі, а не слабасці. Таінства споведзі заснавана на тым, што ўсе мы грэшныя ад нараджэння і мае на ўвазе пошук у сабе памылак і недахопаў. Ці не прывядзе такі пошук да няўпэўненасці і расчаравання?***

— Я назваў бы прызнанне ў сабе грахоў і недахопаў духоўным рэалізмам. Можна не прызнаваць наяўнасць праблем са здароўем — многія так і робяць. Але ад такога стаўлення хвароба не знікне, і, калі яе не лячыць, непазбежна разбурыцца здароўе. Можна не адмаўляцца ад шкодных звычак, не прытрымлівацца прынцыпаў правільнага харчавання, пазбягаць фізічнай актыўнасці — маўляў, мяне і так усё задавальняе. Відавочна, што гэта прывядзе да сур'ёзных наступстваў, якіх можна было пазбегнуць. Назавіце мне ў сучасным свеце хоць бы аднаго абсалютна, стапрацэнтна здаровага чалавека. Мусіць, такіх людзей сёння няма. Тое ж і з духоўнымі хваробамі — страсцямі і грахамі. Хрысціянства кажа, што прырода чалавека пашкоджана грахом і няма чалавека без граху. А значыць, няма чалавека, які не адчувае ў сабе наступстваў гэтага граху. Але ёсць і адваротны бок гэтага медаля: усе мы ўсё ж створаны па вобразе і падабенстве Божым, а значыць, маем светлы, цудоўны патэнцыял, які Гасподзь уклаў у кожнага з нас. І толькі грахі абмяжоўваюць нас у раскрыцці гэтага патэнцыялу. Кожная споведзь — крок у гэтым кірунку, імпульс да ўнутранага аднаўлення. Каб з чыстай душой, адчуваннем шчасця і гармоніі прадоўжаць жыць у гэтым свеце.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# КУДЫ ЗНІК СКАРЫНА З-ПАД КАНОПНІЦЫ?

**ЁСЦЬ выдатны рэсурс для пошуку інфармацыі пра продкаў — базы даных анлайн. Напрыклад, сваякоў, якія ўдзельнічалі ў Першай ці Другой сусветных войнах, можна шукаць адразу на некалькіх парталах. Але што нам гэта дае?**

## Сюрпрыз з Серпухоўскага палка

У першую чаргу вы даведаецеся, якія ўзнагароды атрымаў ваш дзед, знойдзеце загінулых на вайне сваякоў. Часта ў аркушы аб утраце вайскоўцаў ёсць звесткі аб даце нараджэння, месцы гібелі, а таксама аб тых, хто застаўся чакаць яго дома. У некаторых базах ёсць магчымасць паглядзець і спампаваць арыгінал дакумента, дзе згаданы ваш продак. Прынцып карыстання ва ўсіх базах наступны: уводзіце ў радок пошуку прозвішча, і ў спісе знаходзіце патрэбную асобу. Пры гэтым улічвайце, што прозвішча маглі напісаць з памылкай, прыдумвайце розныя варыянты іх напісання. І будзьце ўпэўнены: вас чакаюць самыя неверагодныя сюрпрызы, з якімі таксама сутыкнулася і я.

Не паспела ўвесці літары прозвішча на сайце Памяці герояў Першай сусветнай вайны, як тут жа з'явіўся ўвесь радок цалкам: Скарына Піліп Максімавіч — і гэта быў не хто іншы, як прадзядуля майго мужа па лініі яго маці! Але тое, што я аб ім даведалася, было нечакана і збівала з панталыку. Раней нашы веды аб гэтым продку абмяжоўваліся толькі дзвюма лічбамі на яго помніку на Козыраўскіх могілках у Мінску — 1886—1925. І вось новыя факты сведчаць аб тым, што нешта тут відавочна не сыходзіцца.

На сайце чытаю: «Радавы 120-га пяхотнага Серпухоўскага палка Скарына Піліп Максімавіч, месца нараджэння — Мінская губерня, Ігуменскі павет, Пагарэльская воласць, вёска Малыя Камянічы, знік без звестак 23 лютага 1915 года ў вёсцы Канопніца».

Радок пад № 762 у дакуменце пацвярджае гэты факт, і яго арыгінал захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве. (Вопіс № 1, Справа № 82 239. Імянны спіс страт ніжніх чыноў салдат 120 пяхотнага Серпухоўскага палка забітымі, параненымі, кантужанымі і без вестак зніклымі ў баях з 16 лютага па 10 сакавіка 1915 года.)



Радок пад № 762 сведчыць, што радавы 120-га пяхотнага Серпухоўскага палка Скарына Піліп Максімавіч знік без звестак.

І што тады атрымліваецца? Піліп Скарына знік без звестак ці загінуў... на 10 гадоў раней даты смерці, пазначанай на яго помніку! Але на самай справе прадзядуля Піліп зусім не прапаў, не загінуў — ён застаўся жывы! Цікава, як з'явілася гэта памылка? Паспрабуем зрабіць рэканструкцыю тых падзей, каб знайсці адказ, з дапамогай інфармацыйнага партала, дзе сабраны звесткі аб усіх бітвах Першай сусветнай вайны (gwar.mil.ru).

## «Паравы каток» каля Лодзі

Пачнём з таго, што Серпухоўскі полк быў створаны 11.07.1813 г. і існаваў да 1918 года. З 1813-га — як 52-і егерскі полк, у 1833-м далучыўся да Полацкага і стаў называцца Полацкім рэзервовым пяхотным палком, а 13.08.1863 перайменаваны ў Серпухоўскі. У час Першай сусветнай вайны 120-ы пяхотны Серпухоўскі полк уваходзіў у склад 30-й пяхотнай дывізіі. Дыслакацыя яго знаходзілася ў Мінску з 1903 да 1914 года. Хутчэй за ўсё, Піліп Максімавіч быў прызваны і выходзіў на марш з палком з Мінску.

Дык як жа ён апынуўся ў польскай вёсцы Канопніца, з якой потым знік? Трэба адзначыць, што Канопніца ўваходзіць у склад Велюнскага павета Лодзінскага ваяводства і знаходзіцца каля горада Рава (сучасны Рава-Мазавецкая) і за 60 кіламетраў ад Лодзі. Восенню 1914 года ў гэтым радыусе разгарнулася Лодзінская аперацыя, адна з найбуйнейшых бітваў Першай сусветнай вайны, якую гісторыкі называюць «паравым катком». 120-ы Серпухоўскі полк, дзе служыў Піліп, з 11 лістапада да 19 снежня 1914 года браў у ёй удзел.

**І што тады атрымліваецца? Піліп Скарына знік без звестак ці загінуў... на 10 гадоў раней даты смерці, пазначанай на яго помніку!**

У межах Лодзінскай аперацыі адбыўся бой нямецкіх і рускіх войскаў і пад Брэзінам (Бжэзін). 26—29 лістапада ўдарная група нямецкага генерала Шэфера глыбока абышла фланг 2-й рускай арміі і выйшла ёй у тыл на ўсходзе ад Лодзі. Да іх наблізілася 5-я армія рускіх і прыпыніла Шэфера, той апынуўся ў акружэнні, але з-за павольных няўдалых дзеянняў камандавання рускіх нямецкая армія здолела прарвацца праз Брэзін на поўнач. У выніку бітвы ў левабярэжнай Польшчы план акружэння Шэфера 2-й і 5-й рускімі арміямі скончыўся няўдачай, але і план глыбокага наступлення рускіх на Германію таксама быў сарваны. Абодва бакі — як германцы і аўстрыйцы, так і рускія — былі моцна знясілены. Выйсцем з тупіка мелася на ўвазе выкарыстанне хімічнай зброі.

## «Белы крыж» над Балімовым

Ужыванне атрутных газаў у Першай сусветнай вайне стала буйнай вайсковай інавацыяй ад адносна бяскрыўдных (слёзатачывы газ) да смяротна атрутных — хлор, фасген, іпрыт (гарчычны газ).

На Усходнім фронце немцы ўпершыню ўжылі супраць рускіх смяротна атрутны газападобны хлор у маі 1915 года: пяць хімічных атак яны здзейснілі пад Балімовым. У якасці шостага плацдарма атакавалі Канопніцу.

Але вернемся да зімовых падзей 1915 года, калі ў канцы студзеня — пачатку лютага армія Германіі ўжыла слёзатачывы газ з сумессю бромістага ксіліту і бромістага ксілілену (яны называліся «Белы крыж» з-за маркіроўкі на хімічных снарадах) у баі пры Балімове. Вёска Канопніца знаходзілася за 40 кіламетраў ад Балімова, і цалкам верагодна, што яе закранула тое, што адбылося далей.

Гэтым разам нямецкія войскі ўжылі хімічную зброю ў буйных маштабах. Аднак марознае надвор'е і нізкая тэмпература аказаліся недастатковымі для смяротнай канцэнтрацыі атрутных пароў. Згодна з ваенным дакладам і назіраннямі сведак, мноства людзей, надыхаўшыся ксілілбрамідам, падалі, як мёртвыя, і не падавалі прыкмет жыцця. А потым высветлілася, што яны толькі ўпадалі ў глыбокую непрытомнасць, і большасць з іх пазней прыйшла ў сябе. Ці не было сярод іх і Піліпа Скарыны, якога палічылі за нябожчыка і разам з яшчэ 29 вайскоўцамі ўключылі ў спіс аб стратах, а ён, на шчасце, ачуняў, калі яго полк ужо пайшоў? Ці ваяваў далей 29-гадовы Піліп — невядома, але ён пражыў яшчэ 10 гадоў, у яго нарадзіўся чацвёрты сын Уладзімір, тры старэйшыя — Іван, Міхаіл і Рыгор (дзядуля майго мужа) ужо былі.

Але на гэтым цікавосткі не заканчваюцца.

## «Польскі мех»

На тым жа сайце я знайшла і роднага брата Піліпа — Данііла Максімавіча Скарыну. Ён таксама ваяваў на Усходнім фронце, але ў 119-м Каломенскім пяхотным палку. І гэта зафіксавана, на маё шчасце даследчыка, у дакументах Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва, якія сведчаць: ён быў паранены і 8 жніўня 1915 года паступіў у Маскоўскі шпіталь (лазарэт) з агнястрэльным раненнем без пашкоджання касцей ніжніх канечнасцяў з іншага (неразборліва) шпіталя.

Вельмі падобна на тое, што Данііл удзельнічаў (час і месца супадае) у баявых аперацыях «Польскі мех» — так на вайсковым жаргоне называўся сфарміраваны па цэнтры Усходняга фронту вялікі выступ тэрыторыі Польшчы глыбока на захад, уражлівы з паўночнага і паўднёвага флангаў, у выніку чаго рускія Польшчу страцілі. Дзеянні праводзіліся з 15 ліпеня да 2 верасня 1915 года.



653

(Синія для нижн. чиновъ). На прибывшихъ.

Фамилія Скаринъ

Имя Даніилъ

Отчество Максимовъ

Воинское званіе и часть рядовой Минскаго Продовольств. Магазина

Губернія Минская

Уѣздъ Игуменский

Волость Погорельская

Селеніе (деревня, станица) Малыя Каменцы

Боленъ

Раненъ

Время и мѣсто сраженія

Названіе и подробный адресъ лазарета, сообщающаго свѣдѣнія (штемпель) гор. Минскъ Подгорная ул. Скобелевской

Когда поступилъ въ лазаретъ 30 декабря 1916

У графе «воінская званне» пазначана, што Скарына Данііл Максімавіч — «радавы Мінскага Харчовага Магазіна».

Пра тое, што Данііл працягнуў служыць, сведчыць другі дакумент РДВГА, але дзіўна, што ў графе «воінская званне і часць» чамусьці пазначана «радавы Мінскага Харчовага Магазіна». Выбыў Данііл 30 снежня 1916 года па прычыне хваробы і быў накіраваны ў 1-ы Варшаўскі шпіталь Чырвонага Крыжа горада Мінска.

## На краю вёскі Табознь

Вось так і высветлілася, што родныя браты Скарына з Малых Камянічаў абодва ваявалі ў Першай сусветнай. І пахаваны на адных могілках у Мінску. Піліп — у 1925-м, Данііл — у 1948-м. Але Данііл паспеў яшчэ праславіць сваё прозвішча ў якасці вядомага ў Беларусі партызана і ў Другой сусветнай вайне. Яго імя я знайшла ўжо ў базе partizany.by. Разам з Даніілам Максімавічам партызаніла ўся сям'я. А сыны яго брата — Піліпа Максімавіча, нашага прадзядулі, — ваявалі на франтах. (Іх даныя ёсць на пляцоўцы «Памяць народа» (pamyat-naroda.ru).) Уладзімір Піліпавіч дайшоў да Берліна, быў паранены пад Сталінградам, меў шмат медалёў, пражыў 90 гадоў. А яго старэйшы брат Рыгор Піліпавіч Скарына дамоў не вярнуўся. Пахаваны ў вёсцы Табознь (Табондзь) Дамброўскага (Замброўскага) раёна Беластоцкай вобласці Беларускай ССР (цяпер Польшча). Апошняе месца службы — 459-ы стралковы Верхнедняпроўскі полк 42-й стралковай Смаленскай дывізіі. Дата прызыву: 07.07.1944 г. Чэрвеньскім РВК Беларускай ССР, Мінскай вобласці (ЦАМО, фонд 1140, вопіс 2, справа № 65. Данясенне аб беззваротных стратах).



Рыгор Піліпавіч Скарына быў забіты 23 жніўня 1944 г. — праз адзін месяц і 19 дзён пасля прызыву.

**Згодна з ваенным дакладам і назіраннямі сведак, мноства людзей, надыхаўшыся ксілілбрамідам, падалі, як мёртвыя, і не падавалі прыкмет жыцця.**

Рыгор загінуў 23 жніўня 1944 года — праз адзін месяц і 19 дзён пасля прызыву ва ўзросце 36 гадоў, пакінуўшы маладую жонку Александрыну, якая пражыве 92 гады і адна падыме шасцёра дзяцей, некаторыя з іх таксама дажывуць да 90 гадоў, як дачка Надзея, маці майго мужа.

Наогул, правільнае прозвішча яго родных гучыць проста фантастычна — Скарына! Але, на вялікі жаль, у пашпарце сваякоў пісшаца — Скорын або Скарын. Чаму згубілася іх сапраўднае прозвішча? Чаму не адстойвалі яго, калі ў савецкі час у дакументах зрабілі ў ім памылку? Вось адзіны з выпадкаў, якім падзяліўся Скорын Анатоль, стрыечны брат майго мужа:

«У нашага бацькі, Уладзіміра Піліпавіча Скорына, пасля ранення пад Сталінградам дакументы зусім размыла, у шпіталі не разабралі і напісалі ў новых — «Скорын». Я пытаўся, бацька, чаму ты пакінуў яго? А ён адказаў, што калі гэта заўважыў, то быў ад шпіталя далёка. Дый і якая розніца, — дадаў бацька. — Галоўнае, каб Скорын рабіў добрую справу, тады і яго прозвішча будзе гучаць добра».

Сапраўды, род Скарынаў ніколі не ганьбіў свайго імя. Усе Скарыны з вёскі Камянічы былі добрыя паляўнічыя, меткія стралкі, выдатна разбіраліся ў ружжах, годна ахоўвалі сваю беларускую зямлю.

Аднак я мару: раптам мне пашанцуе аднойчы высветліць, што нашы Скарыны маюць дачыненне да славутага цёзкі?..

Поспехаў і вам, дарагія сябры! Шукайце — і знойдзеце!

**Ала ЖУР.**

### КАРЫСНАЯ СПАСЫЛКІ

**Звесткі аб удзельніках-вайскоўцах сабраны на наступных сайтах:**

- **«Памяці герояў Першай сусветнай вайны» — gwar.mil.ru і 1914.svrt.ru**
- **«Памяць народа» (аб удзельніках Другой сусветнай вайны) — pamyat-naroda.ru**
- **«Подзвігі і лёс партызан у дакументах» — partizany.by**

# «МОЙ ВАРЫЯНТ ШЧАСЦЯ — СЯМ'Я»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Нягледзячы на тое, што я арганізавала больш за тры з паловай тысячы канцэртаў, захацелася атрымаць прафесійную адукацыю рэжысёра канцэртаў, цяпер у мяне ёсць другі дыплом. Была на спецкурсах у расійскіх рэжысёраў, ведаю практычны бок справы, як арганізаваць работу, якую не бачыць глядач. І гэта таксама мой выбар — увесь час развівацца.

***— Верагодна, самы адказны выбар вы здзейснілі, калі пагадзіліся выйсці замуж?***

— Так, мы ж усё выбіраем, як бы ні казалі пра вар'яцкае каханне і пачуцці, пра саюзы, якія складваюцца на нябёсах. Усё гэта таксама важна, але мы самі кажам: «Так». І ў гэты момант робім выбар. Можна адказаць інакш або скарыстацца правам быць аднаму. Я не лічу, што ўсе людзі створаны для сям'і, усё індывідуальна, і тое, што робіць аднаго шчаслівым, іншага можа зрабіць няшчасным. Мой варыянт шчасця — сям'я.

**«Я не лічу, што ўсе людзі створаны для сям'і, усё індывідуальна, і тое, што робіць аднаго шчаслівым, іншага можа зрабіць няшчасным».**

Другі важны выбар я зрабіла, калі сышла з тэлебачання і вырашыла працаваць разам з мужам. Ён вучыўся ў кансерваторыі, даваў канцэрты як арганіст. Я ведала, што ў яго цудоўны голас. Але на той момант мы абодва былі далёкія ад эстрады: ён класічны музыкант, а для мяне артысты былі нібыта з іншага свету. Я магла здымаць хіба што канцэрты ў Доме афіцэраў: працавала карэспандэнтам праграмы «Арсенал» на тэлебачанні, якая была вельмі папулярнай сярод хлопцаў. І раптам я станаўлюся адміністратарам нікому не вядомага калектыву — мужчынскага Канцэртнага хору Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, на базе якога мы з Валерыем пачыналі ствараць «Арт-групу «Беларусы». Усё з нуля: ці атрымаецца?.. Я адмовілася ад таго, дзе ўжо мела поспех, і пайшла ў новую сферу. Я пачала працаваць з «Арт-групай «Беларусы» ў 2004 годзе, і літаральна за год-два гурт стаў вядомы ў краіне...

***— Як жа вы пазнаёміліся, калі хадзілі рознымі дарогамі?***

— Мы настолькі розныя, што сёння я не разумею, як наогул маглі сустрэцца... Я разам з сябрамі сядзела ў рэстаране, быў ужо позні вечар. Тады не было мабільных тэлефонаў у шырокім карыстанні. Да мяне падышла супрацоўніца і запрасіла да гарадскога тэлефона рэстарана. Тэлефанавала мая мама, якая здольна знайсці каго заўгодна дзе заўгодна, калі ёй трэба. Яна сказала, што тэрмінова патрэбна дапамога перакладчыка з англійскай мовы ў храме. Я добра ведала мову і зразумела, што павінна паехаць. Гэта быў каталіцкі храм, вечар напярэдадні канцэрта клавесіннай музыкі. У той дзень прывезлі клавесін і паставілі каля кабінета святара за алтаром. Паўзмрок. Гараць свечкі. Нікога няма. Я іду вельмі няўпэўнена, адчуваю сябе крыху няёмка ў гэтай атмасферы. Не разумею, дзе мне шукаць святара — кабінет зачынены. Саджуся каля кабінета. Раптам перада мной па лесвіцы спускаецца чалавек. Ён сядае за клавесін і 40 хвілін іграе канцэрт



для мяне адной. Мы тады не пазнаёміліся. Прыйшоў святар. А музыкант, сыходзячы, кінуў на мяне позірк праз плячо...

Пару тыдняў мы не бачыліся. Але аднойчы маці адправіла мяне як гледача на канцэрт арганнай музыкі, які праходзіў у тым жа храме. Я падыходжу да дзвярэй, дзе вісіць афіша, а на ёй — імя выканаўцы: Валерый Шмат. Я не ведала, як выглядае гэты чалавек, але ў мяне маланкай прамільгнула думка: «Прозвішча мяняць не буду»...

Я ўсё ж дапамагала святару з перакладам дакументаў, і аднойчы Валерый выйшаў мяне праводзіць — так мы нарэшце пазнаёміліся. А праз тры месяцы зрабіў мне прапанову.

***— Чым запомнілая ваша знаёмства з яго сям'ёй?***

— Валерый нарадзіўся ў сэрцы Налібоцкай пушчы. Вёска Налібакі даволі вялікая, у яе вельмі цікавая гісторыя з XV стагоддзя, там і раскопкі праходзяць. Месца вельмі маляўнічае, мяне ўразіла, калі я ўпершыню прыехала пазнаёміцца з бацькамі Валерыя і яго сям'ёй. Кантраст быў каласальны ў параўнанні з тым жыццём, якое ведала. Я вырасла ў Мінску і была ў бацькоў адна. А ў яго сям'і было чацвёра дзяцей, ён старэйшы. Зусім іншы фармат жыцця, калі сям'я вялікая. Мяне здзівіла, што іх сям'я размаўляе на чыстай беларускай мове. Я разумею, што гэта было натуральна для іх і наогул у вёсцы. Таму Валерый піша песні і на беларускай, і на рускай мове, і канцэрты можа весці сам.

***— Вы, адзіная дачка ў бацькоў, як рашыліся стаць шматдзетнай мамай?***

— Я марыла пра вялікую сям'ю. У самым пачатку сумеснага жыцця не надта задумваліся пра гэта, проста былі шчаслівыя. Але мы вельмі радаваліся, калі праз год пасля вяселля ў нас нарадзіўся Стэфан. Было няпроста. Тады я зразумела, што маё жыццё ніколі не будзе ранейшым, таму што мацярынства — гэта зусім не так, як паказваюць прыгожыя карцінкі ў глянцавых часопісах з усмешлівымі немаўлятамі і гламурнымі мамамі. Справа нават не ў бяссонных начах. Насамрэч дзіця і яго выхаванне — гэта велізарная праца. Гэтая праца прыносіць шчасце, калі ты яе выконваеш з любоўю. Але прыйсці да гэтага таксама няпроста. А я ж была вельмі свабодалюбівай дзяўчынай, любіла сваю работу, шмат падарожнічала. І раптам я разумею, што не магу адлучыцца з дому нават на паўгадзіны, таму што ў мяне дзіця вельмі актыўнае. Як толькі я яго выпускала з рук, яно тут жа пачынала крычаць. А я была з тых мам, якія ведаюць, што карміць дзіця трэба па патрабаванні і на рукі браць. А патрабаваў ён гэтага ўвесь дзень...

Я не сыходзіла ў дэкрэтны адпачынак. Звольнілася з тэлебачання, але засталася ў аспірантуры па міжнароднай журналістыцы. Калі нарадзіўся другі сын Міхась, я сышла з аспірантуры ў дэкрэт. Але ў гэты момант ужо пачала працаваць з Валерыем як адміністратар хору. Мы працавалі разам — літаральна з дзецьмі на руках. Спачатку рабіла званкі з дому, а калі Мішы было сем месяцаў, узялі няньку-студэнтку. Грошай на гэта не было, але мы вырашылі: для таго, каб я магла развівацца як асоба і прафесіянал, мы бяром няньку на чатыры гадзіны, і ўсё, што я зарабляю за гэты час, аддаём ёй.

Можа, недзе было і пачуццё віны, што такіх маленькіх пакідала на няньку. Таму за час, які я праводзіла з імі, хацелася даць ім як мага больш. Мы танцавалі, спявалі, займаліся творчасцю: рабілі карылі з падручных сродкаў, складалі чалавечкаў з макаронаў — шмат чаго прыдумлялі, і нам было цікава. Я з дзецьмі размаўляла на любыя тэмы, каб яны самі прыходзілі да разумення, што можна, што нельга. Заўсёды ж працсей забараніць ці сказаць «не». Але гэта не наш шлях. Няхай я не магу ўкласці ім у галаву сваю думку, але магу ім паказваць прыклад сваімі ўчынкамі. Не заўсёды яны са мной згаджаюцца, і гэта нармальна, бо яны іншыя. Але я ведаю, што яны выраслі і ўмеюць спраўляцца з рознымі сітуацыямі ў жыцці.

**«Мацярынства — гэта зусім не так, як паказваюць прыгожыя карцінкі ў глянцавых часопісах з усмешлівымі немаўлятамі і гламурнымі мамамі».**



Па-першае, усе тры хлопцы вельмі любяць чытаць, у кожнага свае інтарэсы ў свеце літаратуры. Па-другое, яны таксама творчыя асобы. Стэфан сёлета скончыў у Маскве Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі па спецыяльнасці «Прадзюсар кіно». Я шчаслівая, што ён пажадаў жыць і працаваць у Беларусі. Ён дапамог першую маю кнігу «Калі трашчыць лёд» выпусціць у аўдыяфармаце, чытальнікам выступіў папулярны беларускі акцёр Руслан Чарнецкі. Муж напісаў аўтарскую музыку для гэтага праекта, а Стэфан папрацаваў як саўнд-прадзюсар. Міхаіл — студэнт чацвертага курса той жа ВНУ па спецыяльнасці «Прадзюсар кіно». У яго ёсць работа ў Маскве, але ён заўсёды знаходзіць час для маіх праектаў: робіць вокладкі для кніг як дызайнер. Малодшаму Герману 14 гадоў, ён захапляецца гітарай, музыкай. Але вельмі любіць чытаць, набывае шмат кніг. Калі я пісала першы раман, ён быў зусім юным. А ў мяне кнігі дараслыя, пра каханне. Але былі моманты, калі я з ім раілася. Герман вельмі цікава разважае, як маглі б развівацца падзеі ў залежнасці ад жанру: трылер, дэтэктыў ці драма. Прыкмячае дэталі, і здаецца, што ён таксама будзе пісаць.

***— У эстраднай тусоўцы вельмі шмат спакус, асабліва для сям'і. Не баяліся іх?***

— Мы шмат гадоў знаходзіліся па-за тусоўкай. Гэта наш свядомы выбар. У нас былі маленькія дзеці, і, калі паўставаў выбар, каб некуды пайсці, з кімсьці сустрэцца і прыемна правесці час, мы заўсёды выбіралі сям'ю. Але дзеці выраслі, і ў нас з'явіўся час, і тусоўка прыйшла да нас. Мы яе не шукалі, але аказаліся ў эпіцэнтры падзей. І нам тут цікава. Мне падаецца, важна, каб усё было ў правільны час. Няма нічога дрэннага ў зносінах з калегамі ў тусоўках. Ёсць людзі, якія берагуць сваю сям'ю, дзе б яны ні працавалі. І ў шоу-бізнесе я сустракала шмат такіх сем'яў. Проста пра іх не гавораць, а кажуць пра тыя сем'і, якія распадаюцца... Таму мяне не палохае шоу-бізнес ні з якога боку. Я ведаю, што артыст і чалавек у жыцці — гэта розныя з'явы. Напэўна, я б гэтага не магла зразумець, калі б мы не працавалі разам.

Да таго ж падчас гастроляў, канцэртаў, нават падчас працы ў кабінеце ці дома я атрымліваю новыя сюжэты для кніг. Таму што шоу-бізнес — бясцэнная скарбніца ідэй для кніг розных жанраў. Як і наша багатае на сустрэчы жыццё.



**«Мы з мужам выбралі справу, да якой ляжыць душа, і імкнуліся зрабіць гэту справу прафесіяй. Нам гэта ўдалося».**

***— Атрымліваецца, што жыццё ўсё роўна прывяло да таго, чым вы пачыналі займацца першапачаткова, толькі звілістым шляхам...***

— Вядома, ёсць нейкае прадвызначэнне. Тое, што людзі называюць лёсам. Або тая самая выпадковая сустрэча з каханнем з першага погляду. Мы з Валерыем часта абмяркоўвалі: якое шчасце, што мы абодва ў момант знаёмства былі свабодныя. А што б мы рабілі, калі б было інакш? У сваёй першай кнізе я гераіню стаўлю ў сітуацыю, калі ў яе па-іншаму, і трэба рабіць выбар. Бо сям'я — гэта не заўсёды проста, але гэта заўсёды вельмі цікава. І калі мы дзеля блізкага чалавека паступаем не так, як нам бы хацелася, то часта вынік аказваецца нашмат больш значным за тое, што мы маглі б атрымаць, калі б настойвалі на сваім.

Усё роўна я вярнулася да сваёй першай прафесіі праз шмат гадоў: я пішу. Але цяпер тая прафесія, якую я набыла разам з мужам, з сям'ёй, мне вельмі дапамагае. Бо нават выдаўца я знайшла, таму што арганізоўвала канцэрты!

Цяпер мы з'яўляемся арганізатарамі вельмі многіх фестываляў. У тым ліку спрычыніліся да нараджэння найцікавейшага праекта «Вытокі» разам з Алімпійскім камітэтам, галерэяй «Арт-хаус», «БелБрэндАўдытам» і Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, які аб'яднаў розныя гарады нашай краіны. А ў адным гістарычным горадзе задумалі трохдзённы фестываль з традыцыйным балем, канцэртамі эстрадных артыстаў, духавым аркестрам Узброеных Сіл і літаратурна-музычным салонам пад эгідай Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Вялікія мерапрыемствы — гэта заўсёды велізарныя энергетычныя выдаткі. І я ўсё больш думаю аб тым, што не жадаю браць занадта шмат мерапрыемстваў, каб не страціць адчуванне творчасці, каб праца не ператварылася ў руціну.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

*Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце www.zviazda.by*

Скажыце, доктар!..

# НЯПРОСТЫ ПРАСТАТЫТ

## Як захаваць мужчынскае здароўе?

**Прастатыт адносіцца да тых захворванняў, пазбавіцца ад якіх можна з дапамогай старажытнага прынцыпу «лячыць падобнае падобным». Паколькі захворванне, хутчэй за ўсё, было спавакавана няправільным ладам жыцця, то і лячыць яго неабходна таксама ладам жыцця, толькі... правільным. Некаторым можа падацца, што гэта сумна, але іншага выбару няма. Якіх галоўных прынцыпаў варта прытрымлівацца, каб не захварэць, і хто ў групе рызыкі, расказвае ўрач-уролаг, загадчык раённага ўралагічнага цэнтра 6-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі Мінска Ігар ЖУРКЕВІЧ.**

***— Ігар Уладзіміравіч, што такое прастатыт і якія яго сімптомы?***

— Прастатыт — гэта запаленчае захворванне прастаты. Захворванне праяўляецца частымі мочаспусканнямі, болевымі адчуваннямі ў вобласці палавога члена, машонкі, прамой кішкі, сексуальнымі расстройствамі (парушэнне эрэкцыі, ранняя эякуляцыя і інш.), часам затрымкай мачы, прымессю крыві ва ўрыне. Дыягназ прастатыту ўстанаўліваецца ўролагам або андролагам па тыповай клінічнай карціне, выніках рэктальнага даследавання. Дадаткова праводзіцца УГД прастаты, бакпасеў прастатычнага сакрэту і мачы. Лячэнне кансерватыўнае: антыбактэрыяльная тэрапія, імунатэрапія, масаж прастаты, карэкцыя ладу жыцця.

Вылучаюць тры стадыі вострага прастатыту, якія характарызуюцца наяўнасцю пэўнай клінічнай карціны і марфалагічных змен. Пры вострым катаральным пацыенты прад'яўляюць скаргі на пачашчанае, нярэдка балючае мочаспусканне, болі ў прамежнасці. Калі прастатыт востры фалікулярны, болі становяцца больш інтэнсіўнымі, часам аддаюць у задні праход, узмацняюцца пры дэфекацыі. Мочаспусканне абцяжарана, мача выцякае тонкім струменем. У асобных выпадках адзначаецца яе затрымка. Пры гэтым назіраецца субфебрыльная тэмпература (37—38) або ўмераная гіпертэрмія. Пры вострым парэнхіматозным прастатыце назіраецца выяўленая агульная інтаксікацыя, гіпертэрмія да 38—40 °С, дрыжыкі, дызурычныя расстройствы, часта — вострая затрымка мочаспускання, а таксама рэзкія, пульсавальныя болі ў прамежнасці, цяжкасць акта дэфекацыі.

***— Ці можа прастатыт перайсці з вострага ў хранічны і як гэтага пазбегнуць?***

— У рэдкіх выпадках хранічны прастатыт становіцца зыходам вострага працэсу, як правіла, назіраецца першасна хранічнае цячэнне. Тэмпература зрэдку павялічваецца да субфебральных велічынь. Пацыент адзначае слабы боль у прамежнасці, непрыемныя адчуванні падчас акта мочаспускання і дэфекацыі. Найбольш характэрны сімптом — скупыя выдзяленні з урэтры пры акце дэфекацыі. Першасна хранічная форма хваробы развіваецца па працягу значнага перыяду.

Хранічны прастатыт нярэдка з'яўляецца ўскладненнем запаленчага працэсу, выкліканага ўзбуджальнікам спецыфічнай інфекцыі (хламідыя, трыхаманада, урэаплазма, ганакок). Сімптомы спецыфічнага запаленчага працэсу ў многіх выпадках маскіруюць праявы пашкоджання прастаты. Магчыма нязначнае ўзмацненне боляў пры мочаспусканні, слабыя болі ў прамежнасці, скупыя выдзяленні з урэтры пры дэфекацыі. Нязначная змена клінічнай карціны часта праходзіць незаўважанай для хворага.

> Хранічнае запаленне прастаты можа праяўляцца пачуццём гарэння ва ўрэтры і прамежнасці, дызурыяй, палавымі расстройствамі, павышанай агульнай стамляльнасцю. Вынікам парушэнняў патэнцыі (або страху перад гэтымі парушэннямі) нярэдка становіцца псіхічная прыгнечанасць, трывожнасць і раздражняльнасць.

Клінічная карціна не заўсёды ўключае ў сябе ўсе пералічаныя групы сімптомаў, адрозніваецца ў розных хворых і мяняецца з цягам часу. Вылучаюць тры асноўныя сіндромы, характэрныя для хранічнага прастатыту: болевы, дызурычны, сексуальныя расстройствы.

У тканцы прастаты няма болевых рэцэптараў. Прычынай боляў пры хранічным прастатыце становіцца практычна непазбежнае ўцягванне ў запаленчы працэс нервовых шляхоў. Пацыенты скардзяцца на болі рознай інтэнсіўнасці — ад слабых, ньючых да інтэнсіўных, якія парушаюць сон.

У выніку запалення пры хранічным прастатыце павялічваецца аб'ём прастаты, якая сціскае ўрэтру. Прасвет мочаточніка памяншаецца. У хворага ўзнікаюць частыя пазывы на мочаспусканне, пачуццё няпоўнага апаражнення мачавога пузыра.

> На пачатковых стадыях можа развіцца дыспатэнцыя, якая па-рознаму праяўляецца ў розных хворых. Пацыенты могуць скардзіцца на частыя начныя эрэкцыі, адсутнасць аргазму або пагаршэнне эрэкцыі. Болевыя адчуванні пры семявывяржэнні могуць стаць прычынай адмовы ад палавога жыцця. У далейшым палавыя парушэнні становяцца больш выяўленымі. На запушчаной стадыі развіваецца імпатэнцыя.

***— Ці можа прастатыт працякаць бессімптомна?***

— Можа, але гэта безрэцыдыўны перыяд у цячэнні хранічнага працэсу. А хранізацыя працэсу адбываецца пры не зусім адэкватна праведзеным лячэнні, магчыма, пры парушэнні пацыентам рэкамендацый урача-ўролага.

Але самае галоўнае — заўсёды мае месца маніфестацыя працэсу, гэта значыць, яго актыўная фаза: востры перыяд і далей пераход у хранічную стадыю (форму).

***— Якія асноўныя прычыны прастатыту?***

— У якасці інфекцыйнага агента пры вострым працэсе можа выступаць залацісты стафілакок (Staphylococcus aureus), энтэракок (Enterococcus), энтэрабактэр (Enterobacter), сінегнойныя палачкі (Pseudomonas), пратэй (Proteus), клебсіела (Klebsiella). Большасць мікраарганізмаў адносіцца да ўмоўна патагеннай флоры і выклікае прастатыт толькі пры наяўнасці іншых фактараў. Хранічнае запаленне звычайна абумоўлена полімікробнымі асацыяцыямі.

Вылучаюць наступныя фактары, якія правакуюць захворванне: агульнае пераахаладжэнне (аднаразовае або пастаяннае, звязанае з умовамі працы); маларухомы лад жыцця, спецыяльнасць, якая прымушае чалавека працяглы час знаходзіцца ў сядзячым становішчы; пастаянныя запоры; парушэнні нармальнага рытму палавой актыўнасці (празмерная палавая актыўнасць, працяглае ўстрыманне, няпоўная эякуляцыя; наяўнасць хранічных захворванняў (халецыстыт, бранхіт) або хранічных інфекцыйных ачагоў у арганізме (хранічны астэаміэліт, карыес, танзіліт і іншае); перанесеныя ўралагічныя захворванні (урэтрыт, цыстыт і іншае) і захворванні, якія перадаюцца палавым шляхам (хламідыёз, трыхаманіяз, ганарэя); станы, якія прыгнятаюць імунную сістэму (хранічныя стрэсы, нерэгулярнае і непаўнавартаснае харчаванне, рэгулярнае недасыпанне, стан перападтрэніраванасці ў спартсменаў).



> Мяркуецца, што рызыка развіцця паталогіі павялічваецца пры хранічных інтаксікацыях (алкаголь, нікацін, марфін). Некаторыя даследаванні ў галіне сучаснай андралогіі даказваюць, што правакацыйным фактарам з'яўляецца хранічная траўма прамежнасці (вібрацыя, страсенне) у аўтамабілістаў, матацыклістаў і веласіпедыстаў. Аднак пераважная колькасць спецыялістаў мяркуе, што ўсе пералічаныя абставіны не з'яўляюцца сапраўднымі прычынамі захворвання, а толькі спрыяюць абвастрэнню латэнтнага запаленчага працэсу ў тканках прастаты. Вырашальную ролю ва ўзнікненні прастатыту адыгрываюць застойныя з'явы ў органах малога таза.

***— Для мужчын якога ўзросту характэрны прастатыт? Ці праўда, што апошнім часам захворванне маладзее?***

— Прастатыт можа ўзнікнуць у любым узросце. Так, захворванне маладзее, і адбываецца гэта з-за ігнаравання мер прафілактыкі.

***— Хто ў групе рызыкі?***

— Мужчыны «сядзячых» прафесій: ад праграмістаў да вадзіцеляў, халасцякі, «коннікі» і заваўзятыя байкеры, прыхільнікі паходаў і водных відаў спорту, аматары цяжкай ежы.

***— Ці ўплывае на ўзнікненне прастатыту гіперактыўнае палавое жыццё або яго недахоп? Ці магчымае палавое жыццё пры прастатыце? Ці небяспечны ён для жанчыны?***

— Гэтай праблематыцы прысвечана шмат даследаванняў. Урачы-практыкі больш схіляюцца, асабліва ў апошнія гады, да кваліфікацыі гэтых станаў як фактараў рызыкі прастатыту. Палавое жыццё пры прастатыце магчымае і нават пажаданае. Гэтыя парады ўваходзяць у міжнародныя рэкамендацыі і пратаколы лячэння захворвання.

Прастатыт бяспечны для жанчыны, акрамя сітуацый, калі лабараторна пацверджана наяўнасць актыўнага запаленчага працэсу, г.зн. абвастрэння хранічнага працэсу.

***— Як урачы выяўляюць прастатыт?***

— Характэрная клінічная карціна спрашчае працэс пастаноўкі дыягназу пры вострым і хранічным прастатыце. На прыёме ўрач-уролаг праводзіць абследаванне пацыента. Пры неабходнасці прызначаюцца дадатковыя абследаванні. У абавязковым парадку праводзіцца рэктальнае даследаванне прастаты; забор сакрэту прастаты для вызначэння адчувальнасці мікрафлоры (пасеў сакрэту прастаты і бактэрыялагічны пасеў мачы); УГД органаў малога таза; УГД прастаты для выяўлення структурных змен (пухліны, кісты, адэномы) і дыферэнцыяцыі прастатыту ад іншых захворванняў; спермаграма для выключэння або пацвярджэння развіцця бясплоддзя.

***— Ці можа захворванне прайсці самастойна?***

— Не. Востры прастатыт — захворванне, якое мае выяўленую тэндэнцыю да хранізацыі. Нават пры своечасовым адэкватным лячэнні больш чым у палове хворых вынікам становіцца хранічны прастатыт. Менавіта таму трэба своечасова звяртацца па кансультацыю і далейшае адэкватнае лячэнне да кваліфікаванага спецыяліста.

***— Чым небяспечны прастатыт? Якія яго магчымыя ўскладненні і рызыкі?***

— Пры адсутнасці своечасовага лячэння вострага прастатыту існуе істотная рызыка развіцця абсцэсу прастаты. Пры ўтварэнні гнойнага ачагу тэмпература цела павялічваецца да 39—40 °С. Рэзкія болі ў прамежнасці абцяжарваюць мочаспусканне і робяць немагчымай дэфекацыю.

Нарастанне ацёку прастаты прыводзіць да вострай затрымкі мочаспускання. У рэдкіх выпадках абсцэс самаадвольна раскрываецца ва ўрэтру або прамую кішку.

> Для хранічнага прастатыту характэрным з'яўляецца хвалепадобнае цячэнне з перыядамі працяглых рэмісій, падчас якіх запаленне ў прастаце працякае латэнтна ці выяўляецца вельмі бедный сімптаматыкай. Хворыя, якіх нішто не турбуе, нярэдка спыняюць лячэнне і звяртаюцца толькі пры развіцці ўскладненняў.

Распаўсюджванне інфекцыі па мочавых шляхах абумоўлівае ўзнікненне піеланефрыту і цыстыту. Самае частае ўскладненне хранічнага працэсу — запаленне яечак і прыдаткаў яечак (эпдыдымаархіт) і запаленне семянных пузыркоў (везікуліт). Зыходам гэтых захворванняў нярэдка становіцца бясплоддзе.

***— Якія вашы рэкамендацыі па прафілактыцы?***

— Прафілактыка заключаецца ва ўхіленні фактараў рызыкі. Неабходна пазбягаць пераахаладжэнняў, чаргаваць сядзячую работу з перыядамі фізічнай актыўнасці, рэгулярна і паўнавартасна харчавацца. Пры запорах варта выкарыстоўваць слабільныя сродкі. Адной з прафілактычных мер з'яўляецца нармалізацыя палавога жыцця, паколькі як празмерная палавая актыўнасць, так і палавое ўстрыманне з'яўляюцца фактарамі рызыкі ў развіцці прастатыту. Пры з'яўленні сімптомаў уралагічнага ці венерычнага захворвання трэба своечасова звяртацца да ўрача.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества частного торгового унитарного предприятия «ЗападХимТорг»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | ТМ. 25 Сейф | 172,80 | 17,28 | 8,64 |
| 2 | Сейф ASM.63Т | 464,40 | 46,44 | 23,22 |
| 3 | LE-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 4 | LE-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 5 | LE-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 6 | LS-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 7 | LS-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 8 | LS-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 9 | LS-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 10 | LS-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 11 | LS-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 12 | LS-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 13 | LS-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 14 | ТМ.63Т Сейф | 248,40 | 24,84 | 12,42 |
| 15 | ТМ.63Т Сейф | 248,40 | 24,84 | 12,42 |
| 16 | ТМ.63Т Сейф | 248,40 | 24,84 | 12,42 |
| 17 | ТМ.63Т Сейф | 248,40 | 24,84 | 12,42 |
| 18 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 19 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 20 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 21 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 22 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 23 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 24 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 25 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 26 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 27 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 28 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 29 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 30 | Детектор банкнот PRO 12 grey | 37,80 | 3,78 | 1,89 |
| 31 | ASM 63T Сейф | 464,40 | 46,44 | 23,22 |
| 32 | ASM 63T Сейф | 464,40 | 46,44 | 23,22 |
| 33 | ASM 63T Сейф | 464,40 | 46,44 | 23,22 |
| 34 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 35 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 36 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 37 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 38 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 39 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 40 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 41 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 42 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 43 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 44 | Тележка ТГ-150м | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 45 | ТМ. 63Т Сейф | 248,40 | 24,84 | 12,42 |
| 46 | ТМ. 63Т Сейф | 248,40 | 24,84 | 12,42 |
| 47 | ТМ. 63Т Сейф | 248,40 | 24,84 | 12,42 |
| 48 | ТМ. 63Т Сейф | 248,40 | 24,84 | 12,42 |
| 49 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 50 | LS-24 Шкаф | 226,80 | 22,68 | 11,34 |
| 51 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 52 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 53 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 54 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 55 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 56 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 57 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 58 | LS-24 Шкаф для сумок (локер) стандартный | 270,00 | 27,00 | 13,50 |
| 59 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 60 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 61 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 62 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 63 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 64 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 65 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 66 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 67 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 68 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 69 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 70 | Ультрафиолетовый детектор PRO 12 LED | 66,96 | 6,70 | 3,35 |
| 71 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72835 | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 72 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72836 | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 73 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72839 | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 74 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72840 | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 75 | Морозильный ларь МЛГ-350 серый, инв. № 72847 | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 76 | Морозильный ларь МЛГ-350 красный, инв. № 72851 | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 77 | Морозильный ларь МЛГ-350, инв. № 73063 | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 78 | Морозильный ларь МЛГ-350, инв. № 73065 | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 79 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 73521 | 583,20 | 58,32 | 29,16 |
| 80 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 73528 | 583,20 | 58,32 | 29,16 |
| 81 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75132 | 583,20 | 58,32 | 29,16 |
| 82 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75133 | 583,20 | 58,32 | 29,16 |
| 83 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75134 | 583,20 | 58,32 | 29,16 |
| 84 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75135 | 583,20 | 58,32 | 29,16 |
| 85 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75136 | 583,20 | 58,32 | 29,16 |
| 86 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75137 | 583,20 | 58,32 | 29,16 |
| 87 | Холодильник с морозильником Beko RCSK310M20S, инв. № 75138 | 583,20 | 58,32 | 29,16 |
